**10. Никитенко, А.** Пусть не будет войны никогда! : литературно-музыкальная композиция / А. Никитенко // Бібліятэка прапануе. – 2010. – № 4. – С. 4-8.

**11. Николайчук, Н.,** Ирзина, О. Фронтовое милосердие: сценарий литературной гостиной, посвящённой Дню Победы / Н. Николайчук, О. Ирзина; РУО "Оршанский ГМК" // Навечна ў памяці народнай ; склад. Л.І Макаранка і інш. – Мінск : Красіка-Прынт, 2015. – С. 4-8. – (Бібліятэка прапануе: кніжная серыя).

**12. Память сердца** : вечер песни фронтовой // "Жди меня и я вернусь…" / ред.-сост. Л.И. Жук. – Минск : Красико-Принт, 2004. – С. 21-25. – (Праздник в школе).

**13. Победы негасимый свет** : сценарный материал для проведения праздников военной тематики / ред.-сост. Л.И. Жук. – Минск : Красико-Принт, 2015. – 128 с. – (Праздник в школе).

**14. Прохарава, А. Памяць праз гады** : літаратурна-музычная кампазіцыя да Дня перамогі і Дня вызвалення Беларусі / А. Прохарава; ДУА "Сярэдняя школа № 7 г. Наваполацка" // Бібліятэка прапануе. – 2017. – № 5. – С. 16-20. – (Раім адзначыць).

**15. Резник, С.В.** Сражались со взрослыми рядом : литературно-музыкальная композиция / С.В. Резник // Память сердца / ред.-сост. Л.И. Жук. – Минск : Красико-Принт, 2008. – С. 82-92. – (Праздник в школе).

**16. Старавойтава, В.** Боль памяці: літаратурна-музычная кампазіцыя паводле карцін М. Савіцкага "Лічбы на сэрцы" і паэмы П. Броўкі "Голас сэрца" / В. Стравойтава // Няхай ведаюць нашчадкі ; склад. Л.І. Макаранка і інш. – Мінск : Красіка-Прынт, 2015. – С. 6-9. (Бібліятэка прапануе: кніжная серыя).

**17. Трасцянка, А.** Вайна – боль і памяць народа : літаратурна-музычная гасцёўня / А. Трасцянка ; Валожынская дзіцячая бібліятэка // Навечна ў памяці народнай ; склад. Л.І Макаранка і інш. – Мінск : Красіка-Прынт, 2015. – С. 18-24. – (Бібліятэка прапануе: кніжная серыя).

**18. Троцкая, Л.** "Люди мира, на минуту встаньте!" : свободный микрофон / Л. Троцкая ; Дотишская СШ, Вороновский район // Навечна ў памяці народнай ; склад. Л.І Макаранка і інш. – Мінск : Красіка-Прынт, 2015. – С. 25-28. – (Бібліятэка прапануе: кніжная серыя).

**19. Уроки мужества** : сценарный материал / ред.-сост. Л.И. Жук. – Минск : Красико-Принт, 2004. – С. 109-126. – (Праздник в школе).

**20. Харитонова, Е.** Холокост. Пепел войны : литературный час / Е. Харитонова; ГУО "СШ № 1 г. Ганцевичи" // Бібліятэка прапануе. – 2023. – № 5. – С. 7-8. – (Раім адзначыць).

**21. Шишкина, Е.** Строка, оборванная пулей : литературно-музыкальная композиция о поэтах, погибших на фронтах войны / Е. Шишкина // Сценарии и репертуар. – Москва : Культурно-издательский центр «ФЕСТ», 2011. – С. 40-48.

**22. Шульжицкая, А.** О юных героях : информационный и сценарный материал ко Дню юного героя-антифашиста // Праздник в школе. – 2023. – № 5. – С. 9-14.

*РЭКАМЕНДАЦЫЙНЫ СПІС ЛІТАРАТУРЫ ДЛЯ ПАДЛЕТКАЎ*
*(на рускай мове)*

## "СТРАНИЦЫ КНИГ РАССКАЖУТ О ВОЙНЕ"

### Книги о войне для детей и подростков

*Рекомендательный список литературы*
*для учащихся среднего и старшего школьного возраста*

*Для того, чтобы дети знали и помнили о героических подвигах наших дедов и отцов, в них нужно воспитывать патриотические чувства. Для этого необходимо рассказать им о войне, о тяжелых испытаниях, которые пришлось пережить миллионам людей, о борьбе с фашизмом и о Победе. Знакомясь с литературой о Великой Отечественной войне, наши дети должны знать о том, что их сверстники в далёкие сороковые годы прошлого века не только боролись с трудностями военного времени в тылу, но и внесли свой непосредственный вклад в Победу, вступив в борьбу с врагом наравне со взрослыми!*

*Рекомендательный аннотированный список литературы содержит подборку художественной литературы о Великой Отечественной войне для тех, кто хочет больше знать о подвигах и героизме тех людей, которые отстояли нашу страну. Книги адресованы учащимся среднего и старшего школьного возраста.*

**1. Адамович, А.М.** Хатынская повесть / Алесь Адамович. – Москва : Детская литература, 1988. – 223 с.: ил. – ( Школьная библиотека).

*"Хатынская повесть" – талантливо воплощённая память войны, повесть-напоминание, повесть-предупреждение, посвящённая борьбе партизан против немецких оккупантов в Белоруссии во время Великой Отечественной войны.*

**2. Алексеев, С.П.** Сто рассказов о войне (сборник) / Сергей Алексеев – Москва : "Издательство АСТ", 2010. – 58 с.

*Книгу составили избранные рассказы известного детского писателя-историка о Великой Отечественной войне 1941–1945 гг., посвящённые великому подвигу советского народа в борьбе с фашизмом. В них рассказывается о знаменитых сражениях: Московской битве, Сталинградском сражении, битве за Кавказ, танковой битве на Курской дуге, обороне Севастополя, блокаде Ленинграда и взятии Берлина.*

**3. Астафьев, В.П.** Где-то гремит война : рассказ / Виктор Астафьев ; художник М. Петров. – Москва : Современник, 1987. – 51 с.: ил.

*Автобиографический рассказ о сибирском пареньке, о его нелёгком отрочестве и суровой юно сти в военное лихолетье.*

**4. Бакланов, Г.Я.** Навеки девятнадцатилетние : повесть / Григорий Бакланов ; художник А. Веркау. – Москва : Детская литература, 1986. – 175 с.— (Библиотека юношества).

*В повести автор рассказывает о молодости своего поколения, на долю которого выпала война: фронт, ранение, любовь, мужественная жизнь, полная надежд.*

**5. Богомолов, В.О.** Иван. Зося : повести / Владимир Богомолов ; предисл. И. Деткова ; художник О. Верейский, А. Веркау. – Москва : Детская литература, 2014. – 203 с. : ил. – (Школьная библиотека).

*Повесть “Иван” – это повествование о двенадцатилетнем мальчике, который, рискуя своей жизнью в тылу врага, помогает взрослым. Иван мог бы уехать вглубь страны, учиться, расти, но он сознательно выбрал другой путь, ведь враг пока ещё на родной земле, и война не окончена…*

**6. Бондарев, Ю.В.** Горячий снег : роман / Юрий Бондарев. – Москва : Воениздат, 1984. – 336 с. – (Школьная библиотека).

*Роман посвящён одной из героических страниц войны – Сталинградской битве. Время действия романа ограничено всего несколькими днями, в течение которых герои Юрия Бондарева самоотверженно обороняют крошечный пятачок земли от немецких танков.*

**7. Быков, В.В.** Сотников : повесть / Василь Быков; предисл. В. Оскоцкого ; рисунок А. Слепкова. – Москва : Детская литература, 1982. – 15 с. : ил. – (Школьная библиотека).

*В повести писатель затрагивает сложные проблемы : отношение человека к войне, верность долгу, Родине. Речь идёт о предателях, о психологии их поступков.*

**8. Васильев, Б.Л.** А зори здесь тихие…: повесть / Борис Васильев ; художник П. Пинкисевич. – Москва : Детская литература, 1990. – 141 с.: ил. – (Школьная библиотека).

*Действие повести разворачивается в мае 1942 года. Главный герой, Федот Евграфович Басков, получает в распоряжение женский зенитно-пулемётный батальон. Сколько девушек, столько судеб, но в одном они всё же схожи: все судьбы сломала война.*

**9. Васильев, Б.Л.** Завтра была война : повести и рассказы / Борис Васильев. – Москва : Астрель, 2011. – 570, [6] с. – (Великая судьба России).

*Автор создаёт коллективный портрет обыкновенного 9 “Б”, составленный из индивидуальных характеров. Юные герои повести живут в предгрозовое время. Скоро им предстоит взять в руки оружие, а пока они сражаются за свою честь.*

**10. Воробьёв, К.Д.** Убиты под Москвой: [повести] / Константин Воробьёв. – Москва : Вече, 2010. – 228 с. – (Победители).

*В книгу писателя-фронтовика вошли его лучшие произведения: “Это мы, Господи!”, “Крик”, “Убиты под Москвой”, посвящённые событиям первых месяцев Великой Отечественной войны. Эти повести поражают воображение читателей жёсткой “окопной” правдой, рассказывая о героизме простых солдат и офицеров.*

**11. Герман, Ю.П.** Вот как это было : [повесть] / Юрий Герман ; художник Ольга Фадеева ; [предисл. А. Смоляна]. — Санкт-Петербург ; Москва : Речь, 2015. — 95 с. : ил.

*Повесть написана от лица семилетнего ленинградца Мишки. От него мы узнаём, как меняется уютный и невеликий мир мальчишки, когда приходит война. Вместе с друзьями Мишка бегает тушить бомбы-зажигалки, выступает в госпитале, испытывает голод и холод. Война прокралась и в его бесхитростное восприятие жизни. Оканчивается история прорывом блокады, и Мишка с друзьями встречают победителей.*

**12. Думбадзе, Н.В.** Я вижу солнце : повесть / Нодар Думбадзе ; пер. с груз. З. Ахвледиани ; рисунок Г. Акулова. – Москва : Детская литература, 1983. – 159 с. : ил. – (Библиотечная серия).

*Грузинская деревня в годы Великой Отечественной войны. В повести описана жизнь мальчика, который потерял родителей, о его юности. Рядом с мальчиком постоянно была слепая девочка и он не терял надежды, что в один прекрасный момент она сможет увидеть окружающий мир.*

**13. Закруткин, В.А.** Матерь Человеческая : повесть / Виталий Закруткин ; предисловие А. Дымшица. – Москва : Советская Россия, 1983. – 320 с.

*Совсем одна остаётся Мария на страшном пепелище. Одна, но с будущим младенцем под сердцем, осталась она жить, спасшись бегством, а затем вернувшись после ухода карателей на разорённую злодеями землю.*

**14. Ильина, Е.Я.** Четвёртая высота : [повесть] / Елена Ильина ; ил. Т. Хрычёвой. – Москва : АСТ, 2014. – 318 с. : ил. – ( Детская классика).

*История этой короткой жизни не выдумана. Повесть о героине Великой Отечественной войны Гуле Королёвой, о её детстве, школьных годах, о том, как она побывала в Артеке, как снималась в фильмах, о её юности и трагической гибели на фронте.*

**15. Катаев, В.П.** Сын полка: повесть: [лит.-худож. изд. для сред. школ. возраста] / Валентин Катаев; вступ. ст. С. Баруздина ; худож. И. Гринштейн. – Москва: Дет. лит., 2015. – 234 с.: ил. – (Школьная библиотека).

*Главный герой повести – Ваня Солнцев, мальчик, лишившийся семьи, сбежавший из немецкого изолятора, скитающийся один-одинёшенек долгое время, наконец-то попадает к советским солдатам. Благодаря решительности, любознательности, наблюдательности, воле случая он становится хорошим помощником и для разведчиков и для артиллеристов.*

**16. Кассиль, Л.А.** Дорогие мои мальчишки: повесть: [лит.-худож. изд. для внекл. чтения] / Лев Кассиль ; отв. ред. Т. Суворова. – Москва : Эксмо, 2015. – 224 с. – (День Победы. Классика военной литературы).

*Всю Великую Отечественную войну Лев Кассиль (1905 – 1970) работал в тылу: ездил в воинские части, школы, на заводы, выступал по радио. Писатель хорошо знал положение дел в стране, где к станкам встали старики, женщины и подростки. О них он и написал – о тех, кто работал под лозунгом "Всё для фронта, всё для Победы"; о ребятах, которым пришлось быстро повзрослеть, принять на себя огромную ответственность, но которые при этом остались детьми, любящими игры и приключения.*

**17. Кошевая, Е.Н.** Повесть о сыне : повесть / Елена Кошевая.–Москва : Детская литература, 1976. – 206 с. : ил.

*Олег Кошевой, Герой Советского Союза, один из руководителей подпольной комсомольской организации "Молодая гвардия". О жизни Олега, его самоотверженной борьбе рассказывает в своей книге мать героя Елена Кошевая.*

**18. Кондратьев, В.Л.** Отпуск по ранению : повести / Вячеслав Кондратьев ; [вступ. ст. Л. Лазарева] ; художник. Б. Страхов. – Москва : Детская литература, 2011. – 285 с. : ил. – (Школьная библиотека).

*В книгу вошли две повести о войне "Сашка" и "Отпуск по ранению", главный герой которых – молодой солдат, вчерашний школьник, принявший на себя все бремя ответственности за судьбу Родины.*

**19. Носов, Е.И.** Красное вино Победы : сборник повестей, рассказов / Евгений Носов. – Москва : Эксмо, 2010. – 384 с.

*В рассказе автор запечатлел великий день в истории войны – 9 мая 1945 года. Евгений Носов своим рассказом утвердил важную мысль: правда жизни и правда искусства должны быть в согласии, и никогда нельзя забывать, что праздничное вино, вино Победы, красное всегда – и в прошлом, и в настоящем, и в будущем: в нём кровь наших солдат.*

**20. Полевой, Б.Н.** Повесть о настоящем человеке / Борис Полевой. – Москва : Военное издательство, 1984. – 301 с.

*Это одно из лучших произведений о Великой Отечественной войне, которое, к сожалению, в наши дни исключили из школьной программы.*

*Большая часть событий, описанных в повести, действительно произошли в жизни советского летчика-истребителя Алексея Маресьева (в книге его фамилия изменена на Мересьева). Летчик, получивший ранения ног, совершил вынужденную посадку на территории, занятой немецкими войсками. В течение многих дней он ползком пробирался к линии фронта, откуда был отправлен в госпиталь и перенес ампутацию обеих ног. Однако, несмотря на инвалидность, летчик вернулся на фронт, научившись пользоваться протезами во время управления самолетом. Это история о железном характере, несгибаемой воле, победе над собой, болью и страхом, о любви к жизни, к Родине и профессии.*

**21. Платонов, А.П.** Смерти нет! : военные рассказы / Андрей Платонов ; [вступ. ст. Е. Роженцевой] ; художник В. Стуковнини. – Москва : Детская литература, 2012. – 413с. : ил. – (Школьная библиотека).

*Почему победа в Великой Отечественной войне должна была остаться за советским народом, что есть честь и долг – вот главные темы рассказов Андрея Платонова.*

**22. Распутин, В.Г.** Живи и помни : повесть / Валентин Распутин. – Омск : Омское книжное издательство, 1985. – 208 с.

*Андрей Гуськов испугался смерти, потому что два раза судьба уберегла его, в третий раз его на войне может и убить. А дома жена, с которой не успел набыться-навидаться до войны. Не хочется думать, что это подлое, предательское начало сидело в Андрее где-то глубоко ещё до войны. Возможно, это обыкновенное свойство человеческой натуры – инстинкт самосохранения: во что бы то ни стало остаться в живых. Война как лакмусовая бумажка: она проявляет в человеке всё истинное.*

**23. Фадеев, А.А.** Молодая гвардия : роман / Александр Фадеев ; художник В. Щеглов. – Москва : Детская литература, 1988. – 592 с. : ил.

*1942-43 г.г. Подпольная молодежная организация "Молодая гвардия". Около сотни парней и девушек объединились с одной целью – освободить свою страну от окупантов. На протяжении всей книги хочется верить, что всё кончится для ребят хорошо. Автор ярко описывает близкие отношения подростков с родителями, что ещё сильнее заставляет прочувствовать их подвиг по отношению к родине.*

**24. Шолохов, М.А.** Судьба человека : рассказ / Михаил Шолохов ; рис. О. Верейского. – Москва : Детская литература, 1981. – 63 с. : ил.

*Широко известный рассказ о судьбе русского солдата в годы Великой Отечественной войны. Потеряв семью, Андрей Соколов не потерял веру в людей, благородство и нежность.*

*ДАДАТАК 2*

*ТЭМАТЫЧНЫЯ ВЫСТАВЫ*

**“ПРАЗ ПОЛЫМЯ ВАЙНЫ”**
***Кніжна-ілюстрацыйная кампазіцыя***

***I раздзел. “Подзвіг і страты 1941-га”***

***Цытата:***
*Ты кажаш, я не ведаю вайны,*
*Што мне было тады гадоў замала.*
*Чаму ж яна мае забрала сны?*
*На ўсё жыццё наперад сны забрала?*
*Ніл Гілевіч*

***II раздзел. “На акупіраванай зямлі”***

***Цытата:***
*Адплывае на захад гарматны гром,*
*Чорны снег і забітых белыя твары,*
*І пражэктар далёкі светлым багром*
*Б’е маўкліва ў чырвоную хмару пажару.*
*Мне б дабегчы і гэты пажар пагасіць,*
*Толькі рана баліць і замала сіл.*
*За плячыма – тысячы спаленых сёл*
*І дзесяткі разбураных гарадоў.*
*Пімен Панчанка*

***III раздзел. “Беларусь партызанская”***

***Цытата:***
*Партызанскі марш*
*Калі над радзімай пажары шугалі*
*І неба гуло ад грымот, –*
*Пад шумнымі соснамі мы прысягалі*
*Табе, беларускі народ!*
*За край свой забраны*
*Ішлі ў партызаны,*
*Збіраліся дружна на бой!*
*Пятрусь Броўка*

***IV раздзел. "Вызваленне зямлі беларускай"***

***Цытата:***

*Сярод падзей, дзён памятных і святаў,*
*Што традыцыйна адзначаем зараз мы,*
*Важнейшая ў календары дзяржаўным дата –*
*Дзень вызвалення ад карычневай чумы…*

*Мы ўступілі ў новае стагоддзе,*
*Усё далей ад нас жахлівая вайна,*
*Жыве надзея шчырая ў народзе,*
*Што болей ужо не вернецца яна.*

*Ды ўсё ж штогод на пераломе лета*
*Мы будзем кнігу-памяць адкрываць,*
*Каб зноў і зноў успамінаць пра гэта,*
*Пра тое, чаго нельга забываць.*

*Міхаіл Татарановіч (Талачынскі раён). "Дзень вызвалення"*

## "НЕЗАБЫЎНЫЯ ДНІ ВЫЗВАЛЕННЯ"
### Выстава-інсталяцыя

Выстава складаецца з фотазоны, дзе могуць быць прадстаўлены ваенныя эспанаты і ілюстрацыйныя матэрыялы, а таксама кнігі. Тут неабходна змясціць усе неабходныя звесткі аб Вялікай Айчыннай вайне, важных бітвах, героях, успаміны ўдзельнікаў і многае іншае. Кнігі, прадстаўленыя на выставе, павінны даюць чытачу шырокую інфармацыю аб ваенных дзеяннях на тэрыторыі Беларусі, вобласці, края.

***Раздзелы:***

***I раздзел. "Суровы прыпомніцца шлях..."***

***II раздзел. "Памяць аб іх жыве ў Беларусі"***

***III раздзел. "У кнігах – памяць пра вайну"***

## “НЕПЕРАМОЖНАЯ БЕЛАРУСЬ”
### Тэматычная выстава

***І раздзел “Вялікія вехі Вялікай Айчыннай вайны”***

***Цытата:***

*Помнім болі і страты свае.*
*Памяць шуміць, як чароты.*
*О. як нам вас не стае –*
*Кожны чацвёрты…*
*А. Вярцінскі*

***ІІ раздзел “Беларусь партызанская”***

***Цытата:***

*Блізка волі і шчасця прыход,*
*Ашчацініўся лес і палянкі,*
*Не зламаць, не сагнуць мой народ,*
*Бо рэспубліка ўся – партызанка.*
*М. Танк*

***ІІІ раздел “Увайшоўшыя ў бессмяротнасць”***

***Цытата:***

*Часцей, часцей прыпамінай*
*Імёны паўшых смерцю храбрых*
*За родны край, наш мілы край, –*
*Каб над зямлёй, што млела ў ранах,*
*Плыў гэты сіні-сіні ранак,*
*Цвіў гэты белы-белы май, –*
*Часцей, мой друг, успамінай!*
*Н. Гілевіч*

***Спіс літаратуры да прапанаваных тэматычных выстаў:***


1. **Акалович, Н.М.** Освобождение Белоруссии: люди, подвиги / Н.М. Акалович. – Минск : Наука и техника, 1989. – 382 с.: ил.

2. **Акалович, Н.М.** Они защищали Минск: кн. для учителя / Н.М. Акалович. – 2-е изд. перераб. и доп. – Минск : Народная асвета, 1987 . – 280 с.: ил.

3. **Багамолаў, Ул.** Момант ісціны (У жніўні сорак чацвёртага…) : раман / Ул. Багамолаў. – Мінск : Мастацкая літаратура,1984. – 415 с.

4. **Беларусь партизанская** : иллюстрированная энциклопедия партизанского движения в Беларуси в годы Великой Отечественной войны /

под общ. ред. А.М. Литвина. – Минск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2019. – 352 с. : ил.

**5. Быкаў, В.** Кар’ер: раман / В.Быкаў. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1987. – 302 с.

**6. Быкаў, В.У.** Круглянскі мост. Сотнікаў: аповесці / В. Быкаў, прадм. М. Тычыны. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2008. – 334 с. – (Бібіліятэка школьніка).

**7. Великая Отечественная война** советского народа (в контексте Второй мировой войны) : учеб. пособие для 11-го кл. учреждений, обеспечивающих получение общ. сред. образования, с рус. яз. обуч. с 11-летним сроком обучения / под ред. А.А. Ковалени, Н.С. Сташкевича ; пер. с белорус. яз. А.В. Скорохода. – Минск : Издат. центр БГУ, 2004. – 231 с. : ил., карт.

**8. Воронкова, И.Ю.** “Двадцать второго июня, ровно в четыре часа...” : Минск и минчане в первые дни Великой Отечественной войны / И.Ю. Воронкова. – Минск : Беларуская навука, 2011. – 265 с.

**9. Всенародная борьба** в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны : в 3 т. Т. 1 / редкол.: А.Т. Кузьмин [и др.]. – Минск : Беларусь, 1983. – 591 с. : ил.

**10. Герои Бреста** : новые документы, свидетельства очевидцев /сост. П.Н. Панасюк и др. – Минск : Беларусь, 1991. – 320 с.: ил.

**11. Говорят погибшие герои** 1941-1945 / сост. В.А. Кондратьев, З.Н. Политов. – 6-е изд., испр. и доп. – Москва : Политиздат,1979. – 272с.: ил.

**12. Дорогами воинской славы** 1941-1945 : атлас. – Минск : Белкартография, 2020ю – 288 с. : карт., ил.

**13. Дзеці пра вайну** : малюющь і пішуць / уклад. : Д. Пятровіч, В. Шніп. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2015. – 159 с. : іл.

**14. Дубровский, Н.** Бессмертие подвига : документальная повесть / Н. Дубровский. – Минск : Беларусь, 2004. – 112 с.: ил.

**15. Ермаловіч, В.І.** Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны (1941-1945) / В.І. Ермаловіч. – Мінск : Беларусь, 2014. – 183 с. : іл.

**16. Іскры вечнага агню:** зб. вершаў пісьменнікаў-франтавікоў / НАН Беларусі, Інстытут л-ры імя Я. Купалы; уклад. А.А. Васілевіч [ і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 2005. – 488 с.

**17. Казько, В.** Суд у слабадзе: аповесць / В. Казько. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2007. – 238 с. – (Бібліятэка школьніка).

**18. Копылов, А.И.** 18-я гвардейская танковая бригада в боях за Родину (1942-1945) : люди, события, факты / А.И. Копылов. – Москва : Дирижабль, 2021. – 712 с.

**19. Корж, Е.С.** Вся жизнь  – Отчизне / Е.С. Корж. – Минск : Беларусь, 1984. – 239 с.: ил.

**20. Макеева, И.Е.** Эхо июня 41-го : страницы истории / И.Е Макеева. – Гродно : Гродн. тип., 2005. – 264 с.

**21. Навечно в сердце народном** / гл. ред. И.П. Шамякин и др. – 3-е изд., доп. и испр. – Минск : БелСЭ,1984. – 607 с.: ил.

**22. Нельзя забыть.** Нельзя понять. Нельзя оправдать : иллюстрированная энциклопедия сожжённых деревень Беларуси в годы Великой Отечественной войны / ред. кол. : В.В. Андриевич [гл. ред.] и др. – Минск : Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі, 2019. – 304 с. : ил. – (Беларусь помнит: во имя жизни и мира).

**23. Освобождение Беларуси.** 1943-1944 / [редкол.: В.В. Абатуров (пред.) [и др.] ; Ин-т истории НАН Беларуси, НИИ (военной истории) Военной академии Ген. штаба Вооруженных Сил Российской Федерации. – Минск : Беларуская навука, 2014. – 943 с. : ил.

**24. Памяць** : гісторыка-дакументальная хроніка Талачынскага раёна / рэдкал.: І.П. Шамякін [і інш.]; маст. А.М. Хількевіч – Мінск : БелСЭ, 1988. – 654 с., іл.

**25. Подварков, И.И.** С верой в победу / И. Подварков. – Минск: Беларусь, 1991. – 216 с.:ил.

**26. Подвиги их бессмертны** / сост.: Л.В. Аржаева, А.Б. Рогов. – Минск : Беларусь,1978. – 383 с.: ил.

**27. Пташнікаў, І.** Тартак : аповесць і апавяданні / І. Пташнікаў. – Мінск : Мастацкая літаратура, 2000. – 462 с. – (Беларуская проза XX стагоддзя).

**28. Смирнов, С.С.** Брестская крепость : документальная книга / С. Смирнов. – Минск : Мастацкая літаратура, 1991. – 412 с.: ил., портр.

**29. Суслов, А.А.** Творцы Победы : документальные очерки / А. Суслов. – Минск : Мастацтва, 2010. – 158 с.: ил.

**30. Шамякін, І.** Глыбокая плынь : раман : для сярэдн. і старэйшага школьн. узросту / І. Шамякін ; прадм. А. Марціновіча. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1996. – 286с.

**31. Шиманский, М.Н.** Это нужно живым / М.Н. Шиманский. – Минск : Парадокс, 2004. – 480 с.: ил.

*ДАДАТАК 3*

*СЦЭНАРЫІ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ*

## ДАРОГАЙ ПАМЯЦІ
### Літаратурна-музычная кампазіцыя

На 3 ліпеня прыпадае Дзень вызвалення Беларусі ад гітлераўскіх захопнікаў. Восемдзесят гадоў таму наш беларускі народ здабыў свабоду і незалежнасць. Наперадзе, у наступным годзе, будзе адзначацца яшчэ адно вялікае свята – 80-годдзе з Дня Перамогі над фашызмам у гады Вялікай

Айчыннай вайны. Матэрыялы распрацоўкі прапануюцца для правядзення мерапрыемстваў у бібліятэках для падлеткаў і моладзі.

**Мэты:** выхаванне нацыянальнай і грамадзянскай самасвядомасці, павагі да гераічнага мінулага сваёй Радзімы; фарміраванне грамадзянскай пазіцыі і патрыятызму ў юнага пакалення сродкамі літаратуры і мастацтва; захаванне светлай памяці пра воінаў і ахвяр Вялікай Айчыннай вайны.

**Абсталяванне:** выстава экспанатаў часоў Вялікай Айчыннай вайны (пры наяўнасці); выстава кніг беларускіх пісьменнікаў на тэму вайны; мультымедыйная ўстаноўка, экран.

**Ход мерапрыемства.**

**Першы чытальнік.**

Час хаду у новы дзень прыспешвае,
Успаміны горкія драбніць...
А ўсё роўна помнім сорак першы,
Як і сорак пяты, – да драбніц.

Не закрыць ні радасцю, ні бытам
Тых, што ўпалі ніцма на лаўжы.
Колькі іх, забітых і забытых,
Пад нагамі нашымі ляжыць!..

І што значаць нашы ўсе напасці,
Калі можна ў цішы палявой
На калені перад імі ўпасці
І да іх прыпасці галавой...

*Генадзь Бураўкін*

*Гучыць пачатак песні “Белая Русь ты мая” (муз. У. Мулявіна, сл. У. Скарынкіна), змяняючыся гукам кананады*

**Другі чытальнік.**

Не бура нам стрэхі сарвала,
Не ветры павыбілі шыбы, –
Чужая, ліхая навала
Разбурыла нашы сялібы...

*Пятрусь Броўка*

**Трэці чытальнік.**

Па-над Белаю Руссю палаюць кастры,
Над усёю зялёнай планетай – кастры.

Нада мною – кастры,
Пада мною – кастры, –
Я не бачыў такое злавеснай зары...
*Сяргей Законнікаў.*

**Чацвёрты чытальнік.**
Суровы час. Мая Радзіма
Гарыць у полымі вайны.
З паходнай кайстрай за плячыма
На зборны пункт ідуць сыны.
Яны надоўга пакідаюць
Свой родны дом, свой мілы кут,
Усіх, усіх, каго кахаюць,
Усё, усё, што люба тут.
*Пятро Глебка.*

*Дэманструецца слайд "Брэсцкая крэпасць".*
*Гучыць "Рэквіем" І. Карнелюка.*

**Пяты чытальнік.**
Ты не схіснуўся у знямозе,
Граніцы нашай вартавы,
І першым вырас на парозе
На дальніх подступах Масквы.
Апасці не паспелі росы
У той перадсвітальны міг,
А ты, нібы юнак Матросаў,
Краіну засланіў грудзьмі.
*Васіль Вітка.*

**Шосты чытальнік.**
Выходзіў я з Мінска,
Калі ён гарэў...
Здавалася, сам ты дашчэнту згараеш.
І чорныя пальцы абвугленых дрэў
У твар мне крычалі:
"Нашто пакідаеш?"...
Ішоў я, бяздомны,
Ад бомбаў, ад куль
Праз рэкі, балоты,
Па грэблях і кладках...
Адно, што ў дарогу я вынес адтуль, –
Дык гэта ўспаміны і сынаву картку.
А ўсё засталося:

І пройдзены шлях,
І горад з прасцёртымі ў дыме рукамі,
І ты, засмучоная наша зямля,
Аблітая ў ростані буйна слязамі.
Мы йшлі
І не чулі натруджаных ног,
І неслі журботу з нянавісцю разам,
І там, ля разбітых вайною дарог,
На некалькі год пастарэлі адразу.
Няма мне спакою.
І нават праз сон
Мне помніцца горад у смутку вялікім,
І чорныя плямы аслепшых акон,
І плошчы, распятыя жудасным крыкам...

*Пятрусь Броўка.*

**Сёмы чытальнік.**

О, колькі ў шумных гушчарах
Народных дум было сабрана,
І колькі на сівых імхах
Гарачых слёз парассыпана!
Там мы жылі ў барах густых,
Каб ратавацца ад прымусу,
Там з кожным дрэвам, што з жывым,
Вялі параду беларусы.

*Пятрусь Броўка.*

*Гучыць песня «Беларускім партызанам» (муз. У. Мулявіна, сл. Янкі Купалы).*

**Восьмы чытальнік.**

Ля гэтых сосен нельга не спяваць.
Нібы ахопленыя полымем пажару,
Яны, чырванастволыя, шумяць,
Калышучы вяршаліны, як хмары,
Гуллівыя, густыя, ад якіх
Не знае цішыні-спакою Нарач.
Ля гэтых сосен цяглых, векавых
Не ўспомніць нельга грозных дзён
мінулых,
І партызанскіх вогнішчаў, і тых,
Чые курганы слава ахінула.

*Максім Танк.*

*Дэманструецца слайд "Хатынь".*

**Першы чытальнік.**

Вышыні святла – святыні,
Саласпілсы, Хатыні,
Крэпасці Брэсцкай руіны,
Вы ўжо не толькі ўспаміны,
Што душы людскія крояць,
А памяць, прысяга і споведзь,
Запісаныя навечна
На дрэве магутным, рассечаным
Маланкаю да карэння.
Не вытрывала знямення,
Загаварыла каменне
Такой невымоўнай пакутай –
Не чутай яшчэ, не адкутай
Ні ў бронзе, і ні ў жалезе,
І ні ў радках паэзіі...

*Васіль Вітка.*

*Дэманструецца слайд "Канцлагер "Трасцянец".*
*Гучыць музыка І. Карнелюка "Няма спакою"*

**Другі чытальнік.**

Суайчыннік, стань!
Тут знішчалі людзей.
Суайчыннік!
Запомні навек:
Тры гады па сто трыццаць сем у дзень
І ў гадзіну – па шэсць чалавек.
Гэта значыць, што кожныя дзесяць хвілін
Тут навекі чарнеў небакрай.
Попел сэрцаў нашых ракоча ў зямлі:
Памятай!
Памятай!
Памятай!!!

*Уладзімір Караткевіч.*

*Музыка змаўкае. Хвіліна маўчання.*

**Трэці чытальнік.**

Навекі слава тым, што ў полі ратным
Загінулі за родныя палі,
За наш народ, за лёс народаў братніх,
За дзень наступны усяе зямлі.
Бяссмертныя іх помнікі крані ты –

І цеплыню адчуеш пад рукой:
Іх высеклі не з камняў, не з граніту, –
З людской любві, з удзячнасці людской.
*Пімен Панчанка.*

**Чацвёрты чытальнік.**
Калі, ідучы, завітаеш
На поле бою старое,
Па надпісу адшукаеш
На ім ты магілу героя...
І не здзіўляйся вельмі,
Не думай, што гэта здаецца,
Калі ў глухім падзямеллі
Ягонае сэрца заб'ецца.
І не здзіўляйся бясконца,
Калі ён адтуль спытае,
Якое на небе сонца
І сінява якая.
Хаця ён і быў пахаваны
Пад музыку, песні, вершы,
Але назваць яго можна
Хутчэй жывым, чым памершым.
Перад палком выклікаюць
Яго і цяпер на паверцы,
Калі трапечуцца сцягі
І салдацкія сэрцы.
І кожны раз называюць
Пры гэтым і поле бою,
Дзе лёг ён на сталь кулямёта,
Сяброў засланіўшы сабою.
*Аркадзь Куляшоў.*

*Гучыць песня "Было ў салдата два полі" (муз. Э. Ханка, сл. А. Вярцінскага).*

**Пяты чытальнік.**
Шпітальным прыуральскім летам
з насценнага календара
лісток звычайны перад гэтым
сарвала ўвечары сястра.

Са мной да поўначы не спалі
ў палаце ціхай землякі,
ударам сэрца бласлаўлялі
удару нашага палкі

і думалі аб тых брыгадах,
што, набліжаючы франты,
на рэках, цёмных аўтастрадах
за Нёманам ірвуць масты.

А дзень устаў з-за плеч Урала –
чырванасцяжная зара
святлом святочным фарбавала
у Мінску ліст календара.

На мыліцах рыпучых, групай,
забыўшы свой шпітальны лёс,
мы абкружылі шумна рупар
і не саромеліся слёз.

*Анатоль Вялюгін.*

*Гучыць песня "Верасы" (муз. І. Лучанка, сл. М. Алтухова).*

**Шосты чытальнік.**

Калі зямля спакойна засынае
І ў зорак нават сплюшчваюцца вейкі,
Тады здаецца, што на цэлым свеце
Не спяць адны вартаўнікі.
А інвалідам і тады не спіцца,
Смыляць незарубцованыя раны,
І нудна, аднастайна, раўнадушна
Пратэзы ў цішыні начной рыпяць.
Успыхваюць у цемры папяросы –
І дым, ад дум салдацкіх пасівелы,
Плыве, плыве бясконцым Шляхам Млечным
І колькі год ніяк не растае.
Бяссонніцу праносяць інваліды
Шляхамі дваццаць першага стагоддзя.
І ў іх вачах гарыць, не патухае
Ці то чырвонае густое сонца,
Ці бітваў незакончаных агонь.

*Генадзь Бураўкін.*

**Сёмы чытальнік.**

Не бачыў я праклятай той вайны.
Чаму ж яна ў мае прыходзіць сны?
Чаму ў мяне страляе аўтамат?

Я ж чуў пра гэта толькі ад салдат.
Такое толькі бачыў у кіно.
Але чаму мне сніцца ўсё адно?

*Мікола Шабовіч.*

*Інсцэніроўка верша Максіма Танка "Перакройванне шыняля".*

**К р а в е ц.**
– Нешта вы, маці, сыноўскі шынель гэты доўга хавалі. Зараз прыкіну, што можна пашыць з яго Вашаму ўнуку. Вось толькі шкада, мо недзе ля печы рукаў асмаліла...

**Жанчына.**
– Не, у той дзень наша вёска гарэла...

**Кравец.**
– Ну, я памяркую, прыкіну. Ды тут і крысо, зачапіўшыся, нехта падзёр на цвіку.

**Жанчына.**
– Не, гэта – на дроце калючым...

**Кравец.**
– Тут можна было б падтачыць. Вось толькі на самых грудзях невялічкая дзірка ад молі...

**Жанчына.**
– Не, гэта ад кулі...

*Гучыць "Плач удавы" (муз. У. Мулявіна, сл. Янкі Купалы).*

**Восьмы чытальнік.**
Як глянь: бярозы свечкамі,
Нязманлівым святлом –
Над перакатнай рэчкаю,
Над ціхім азяром.
Ды родны край баронячы,
Праз жыта, праз ільны –
Усё яшчэ, усё яшчэ! –
Ідзе салдат з вайны.
Ідзе ён цёмнай ночанькай,
Ідзе спякотным днём,
Бо ўсё яшчэ, бо ўсё яшчэ
Планета пад агнём.

Як завіруха белая,
Як белая сцяна,
Нявеста пасівелая
Прымоўкла ля акна.
Гудуць вяселлі новыя
Ў суседак на двары. ...
Дзве чаркі палыновыя
З мядовае пары.

*Яўгенія Янішчыц.*

*Выходзяць усе чытальнікі.*

**Першы чытальнік.**

Жывём, як светлай памяці зарок.
Дзе б ні было – у Гродна, а ці ў Мінску,
З нас кожны мае ціхі свой куток
І ў ціхім тым кутку – па абеліску.

**Другі чытальнік.**

Я ведаю: ёсць час скупы і горкі,
Ёсць міг, калі у подзвігу сваім
Жывыя ўсё ж звяртаюцца да мёртвых
І мёртвыя адказваюць жывым!

*Яўгенія Янішчыц.*

**Трэці чытальнік.**

У адным з пісем Мікалая Рэрыха, датаваным 1945 годам, якое захоўваецца ў фондзе Славянскага антыфашысцкага камітэта, ёсць такія радкі: “Оксфардскі слоўнік узаконіў некаторыя рускія словы, прынятыя цяпер у свеце, напрыклад, “указ” і “савет”... Варта было б дабавіць яшчэ адно –неперакладальнае, мнагазначнае слова “подзвіг”. Як ні дзіўна, ні адна еўрапейская мова не мае аналагічнага слова хаця б прыблізнага значэння...”

**Чацвёрты чытальнік.**

Даўно лісты на дрэвах адпалалі,
Але гарыць ля помніка агонь,
Нібы салдаты вогнішча расклалі
І грэюцца, як колісь, ля яго...
Я слухаю святую цішыню...
І мне цяплей ад гэтага агню.

*Мікола Шабовіч.*

**Пяты чытальнік.**

Столькі зведаўшы гора, нягод,
Столькі слёз, і крыві, і агню –
Ты, Радзіма, на тысячы год
Заслужыла сабе цішыню.

**Шосты чытальнік.**

Ні пра што не забыўшы ад той
Гераічнай і грознай пары, –
Больш за ўсё ты вартуеш спакой,
Больш за ўсё цэніш міру дары...

**Сёмы чытальнік.**

Хай жа ў кроплях світальнай расы
Ціха падаюць зоркі на дол.
Хай увосень страсаюць лясы
Дождж іглiцы і град жалудоў.

**Восьмы чытальнік.**

Хай на звонкіх арэлях вясны
Сонца гушкае мары дзяўчат.
Хай ад чорнай, як смоль, баразны
Будзе сейбіту светла ў вачах...

*Ніл Гілевіч.*

*Урачыста гучыць песня "Белая Русь ты мая"*
*(муз. У. Мулявіна, сл. У. Скарынкіна).*

**Спіс выкарыстаных крыніц:**

**1. Бярозавая рунь**: сучасная беларуская паэзія : для сярэдн. і ст. шк. узросту / склад. В. Шніп. – Мінск : Беларуск. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2011. – 272 с. – (Школьная бібліятэка).

**2. Танк, М.** Вершы і паэмы : для ст. шк. узросту / М. Танк, А. Куляшоў, П. Панчанка; уклад. З.Г. Дзямешка. – Мінск : Універсітэцкае, 1999. – 272 с. – (Школьная бібліятэка).

**3. "Дарогай памяці..."** Сцэнарый ... : [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://сцэнар.дамен.бел›dzen-peramogi/i-pamyac-gavoryc-z…

## У НАШЫХ СЭРЦАХ – ПАМЯЦЬ АБ КОЖНЫМ ЧАЦВЁРТЫМ
### Урок мужнасці

***(сцэнарный змяшчае краязнаўчы матэрыял пра першыя дні вайны ў краі (Супрун С.П.), аб героях вайны, ураджэнцах краю, сведкі пра гета на тэрыторыі Талачыншчыны)***

### Ход мерапрыемства

*Гучыць вакальна-сімфанічная паэма "Вечна жывыя" Г. Вагнера.*
*На сцэну выходзяць вядучыя.*

**1-ы вядучы.** Усім, хто не вярнуўся з крывавых палёў вайны, прысвячаецца.

**2-і вядучы.** Слаўным ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, якія выстаялі, перамаглі, далі свету жыццё і шчасце, прысвячаецца.

**3-і вядучы.** Пакаленню, якое ўступае ў жыццё, прысвячаецца.

*Гучыць песня "Свяшчэнная вайна". Паступова мелодыя заціхае.*

**1-ы чытальнік.**
Я чую голас несціханы.
Зямля мая мяне заве
І кроіць сэрца мне на раны,
Звініць, як звон касы ў траве.

**2-і чытальнік.**
Слоў няма, каб цяпер гаварыць,
Яны анямелі.
Слёз няма, каб наўзрыд праліць,
Яны скамянелі.
А навокал – вайна.

**3-і чытальнік.**
Не, не будзе мой край любімы
Пад фашысцкай пятою стагнаць.
Беларуса дастойнае імя
Я нікому не дам зганьбаваць.

*На сцэну выходзяць тры пары. Першая пара – дзве сястры,*
*другая – муж і жонка, трэцяя – юнак і дзяўчына.*

– Люда, радзімая. Што я скажу маці?
– Я сама ей напішу з дарогі.

– Не плач, я хутка вярнуся.
– Так, хутка ўсё скончыцца, пра нас не клапаціся.
– Дзяцей беражы, дзяцей.
– А як жа я?
– Я не магу інакш.
– Там людзі гінуць.

**1-ы вядучы.** На досвітку 22 чэрвеня 1941 года гітлераўскія войскі вераломна напалі на Савецкі Саюз.

Гераічна змагаліся абаронцы Брэсцкай крэпасці. За тыдзень баёў байцы пагранічнай заставы лейтэнанта А.М. Кіжаватава знішчылі каля батальёна гітлераўцаў. Гарнізон крэпасці пратрымаўся каля месяца, хоць нямецкія генералы планавалі на яе захоп толькі 3 гадзіны. Апошнія дні абароны крэпасці авеяны легендамі. На сценах крэпасці былі зроблены надпісы, якія ведае ўвесь свет: “Паміраю, але не здаюся. Бывай, Радзіма”.

**2-і вядучы.** Адважна змагаліся лётчыкі ў небе Беларусі. Вядомы подзвіг А. Данілава, які ўступіў у адзінаборства з дзевяццю “месершмітамі”, збіў два з іх і тараніў трэцяга. Каля Радашковіч здзейснілі гераічны подзвіг камандзір эскадрыллі, ураджэнец Беларусі капітан Мікалай Гастэла і члены яго экіпажа – Анатоль Бурдзянюк, Рыгор Скарабагатаў і Аляксей Калінін. Ахоплены полымем самалёт экіпаж накіраваў на групу нямецкіх танкаў і аўтамашын. Толькі за адзін дзень байцы стралковага палка пад камандаваннем палкоўніка Куцепава знішчылі 39 танкаў. Пра гэтыя падзеі расказаў у рамане “Жывыя і мёртвыя” пісьменнік Канстанцін Сіманаў.

Адважна змагаўся легендарны лётчык-выпрабавальнік, двойчы Герой Савецкага Саюза Супрун Сцяпан Паўлавіч, які 4 ліпеня 1941 года гераічна загінуў у небе над Талачыншчынай падчас сутычкі з варожымі самалётамі.

**3-і вядучы.** Ужо на пяты дзень вайны ў Пінскім раёне быў сфарміраваны партызанскі атрад, які ўступіў у бой з захопнікамі... У ліпені 1941 года рабочыя кардоннай фабрыкі ў пасёлку Пудаць Суражскага раёна стварылі партызанскі атрад пад кіраўніцтвам свайго дырэктара М. Шмырова. Бацька Мінай – так называлі яго партызаны. За кіраўніка партызанскага атрада фашысты давалі 30 тысяч марак, але здраднікаў сярод партызан не знайшлося. Тады акупанты схапілі чацвярых дзяцей Міная ў якасці заложнікаў і расстралялі. Беларускую зямлю справядліва называюць краем быліннай партызанскай славы і воінскай доблесці.

**4-ы вядучы.** Побач са сваімі бацькамі, дзядамі ваявалі хлопчыкі і дзяўчынкі. Так, подзвіг братоў Цубаў паўтарыў 12-гадовы хлопчык Ціхан Баран. А хто не ведае подзвіг Марата Казея – юнага разведчыка партызанскай брыгады?

Валянцін Дончык у 12 гадоў стаў партызанам атрада імя С.М. Кірава, у 13 – пайшоў на фронт. Малодшаму сяржанту Валянціну Дончыку было 14 гадоў, калі ён распісаўся на рэйхстагу.

Зінаіда Корж усю вайну была санінструктарам. З эскадронам разведкі здзяйсняла яна дзёрзкія рэйды ў тыл праціўніка.

Юныя абаронцы Брэсцкай крэпасці Пётр Клыпа, Пётр Васільеў, Мікалай Новікаў, Уладзімір Козьмін, Сцяпан Аксёнаў у час асады даглядалі цяжкапараненых, набівалі патронамі стужкі станкавых і ручных кулямётаў, выносілі байцоў, якія сцякалі кроўю, замянялі тых, хто не мог трымаць зброю.

**5-ы вядучы.** На акупіраванай тэрыторыі Беларусі нямецка-фашысцкія захопнікі ўводзілі “новы парадак”. Адносіны да беларусаў былі вызначаны ў плане “Ост”, згодна з якім прадугледжвалася 75% рускіх, беларусаў, украінцаў фізічна знішчыць, а астатніх ператварыць у рабоў. На Беларусі было створана больш як 260 лагераў смерці. У кожным раёне дзейнічалі канцлагеры, турмы, гета. У Мінску і яго ваколіцах знаходзілася пяць такіх лагераў. Адзін з іх – Трасцянец. Трэці пасля Асвенціма і Майданака па колькасці знішчаных людзей – 206 500. Людзей палілі, цкавалі сабакамі, закопвалі жывымі ў зямлю, атручвалі газам.

**1-ы чытальнік.**

Суайчыннік, стань!
Тут знішчалі людзей!
Суайчыннік!
Запомні навек:
Тры гады па сто трыццаць сем у дзень,
І ў гадзіну – па шэсць чалавек.
Гэта значыць, што кожныя дзесяць хвілін
Тут навекі чарнеў небакрай.
Попел сэрцаў нашых ракоча ў зямлі:
Памятай...
Памятай...
Памятай...

**1 -ы вядучы.** За час акупацыі гітлераўцы правялі ў Беларусі больш як 140 карных экспедыцый, у час якіх цэлыя раёны ператварыліся ў “зоны пустыні”.

*Словы чытаюцца на фоне мелодыі песні “Хатынь”.*

Беразнякі, Бор, Боркава, Бярозка... Усяго 619 вёсак. Тужлівая цішыня... Яна ўвабрала ў сябе гул шалёнага агню, надрыўны плач дзяцей і страшэнны крык маці, віскатлівы захлёп аўтаматаў і стогны паміраючых ад куль. І сярод іх – Хатынь. 22 сакавіка 1943 года фашысты спалілі жывымі ўсіх жыхароў

гэтай вёскі. У агні загінулі 149 чалавек, у тым ліку 76 дзяцей. Назва Хатынь стала сімвалам трагедыі беларускага народа ў гады вайны.

**2-і вядучы.** Талачын, Коханава, Абольцы, Слаўнае… У гэтых населеных пунктах Талачынскага раёна ў гады вайны існавала габрэйскае гета, дзе загінула больш за 500 чалавек.

**1-ы чытальнік.**

Вы чулі, як у Хатыні
Звоняць каміны?
Кроў у жылах стыне,
Як слухаеш тыя званы.
Кроў у жылах стыне,
Слухаеш і маўчыш,
А наўкола – пустыня,
А наўкола – ціш.
Толькі адны каміны...
Толькі адны званы...
Толькі адны яны...

**2-і вядучы.**

Званіце званы ў Хатыні,
Зганяйце санлівую стынь!
Хай голас народнай святыні
Кране ўсіх краін далячынь!
Званіце балюча, няспынна,
Званіце ад веку ў век,
Каб з попелу сэрцы нявінных
Пачуў, зразумеў чалавек.

**2-і вядучы.** Звоняць, звоняць званы Хатыні, горам адгукаюцца ў душах людзей, якія перажылі жудасныя гады акупацыі, і тых, хто нарадзіўся пасля вайны.

**3-і вядучы.** Дарогі вайны... Колькі іх пройдзена савецкімі воінамі па стэпах і балотах, камяністых перавалах і ўзгорках, лясных масівах і чыстых палях. Удзячнае чалавецтва заўсёды будзе помніць пра стойкасць, мужнасць, самаадданасць савецкіх салдат.

*Інсцэніроўка ўрыўка з рамана "Зеніт" Івана Шамякіна.*

**Дзеючыя асобы:**

***Павел Шыянок*** – малодшы лейтэнант.

***Ліда Асташка*** – малодшы сяржант.

*Гучыць мелодыя песні “Два полі”*
*(словы Анатоля Вярцінскага, музыка Эдуарда Ханка).*

**Павел** (разважае ўслых). Мы плывём вельмі павольна. За кармой шыпіць і пеніцца вада. А там на носе баржы – зорка. Дзіўная гэта зорка. Яна не плыве, а нібы пераскоквае праз хвалі. Я заснуў, бо нейкае імгненне нічога не бачыў. Але пачуў толькі, што побач са мной хтосьці стаіць. Прачнуўся, але здавалася мне, што сплю і сню сон: побач – Ліда. Я нядаўна думаў пра яе, так хацелася, каб яна прыйшла ў мой сон.

**Ліда** *(падыходзіць).* Спі!

**Павел.** Ліда?

**Ліда.** Цішэй.

**Павел.** Табе не спіцца?

**Ліда.** Давай пастаім і памаўчым. Паглядзі, бачыш тую зорку ў вадзе?

**Павел.** Бачу. Мы плывём за гэтай зоркай, нібы імкнёмся дагнаць яе...

**Ліда.** А яна ўцякае ад нас...

**Павел.** Памятаеш, падышла: “Вы ў Гомелі вучыліся? Шыянок – ваша прозвішча?”

**Ліда.**А потым яшчэ аказалася, што мы вучыліся ў адным тэхнікуме.

**Павел.** Індустрыяльна-педагагічным, я на апошнім курсе, а ты – на першым.

**Ліда.** Вы, выпускнікі, на нас, першакурсніц, ніякай увагі не звярталі.

**Павел.** Але ж я адразу пазнаў цябе, Ліда.

**Ліда.** Ты не баішся, Павел?

**Павел.** Чаго?

**Ліда.** Мін.

**Павел.** Навошта іх ставіць тут, міны?

**Ліда.** І я не баюся, Паўлік! Ніколі не баялася ні самалётаў, ні бомбаў. А сёння баюся... Загінуць у такі час!.. Ідзе вызваленне родных мясцін, дарагой Беларусі. А можа, ужо мая вёска Грыбавец вызвалена... І мама жывая... І ёй напішуць, калі патонем.

**Павел** *(з папрокам).* Ліда!

**Ліда.** Не буду. Гэта я так... Не думай, я не баязліўка. Проста паміраць не хочацца. Давай памаўчым.

*(Ліда выходзіць).*

**Павел.** А потым... Калі ўжо былі ў Мядзведжа-горску, нечакана з'явілася Ліда. Бачу – бяжыць ад батарэі, расчырванелася.

**Ліда.** Таварыш малодшы лейтэнант! Старты сяржант Лідзія Асташка прыбыла ў ваша распараджэнне.

**Павел.** І не паспела яна гэта сказаць, як раптам грымнула... Мяне ўдарыла па галаве. Я, напэўна, страціў прытомнасць. Я ляжаў каля дзвярэй. Пакой быў поўны дыму і пылу. Сцяміў, што здарылася: міна. У дзень пахавання нахмурыла, пачаў ісці дробны дождж. Плакала неба. Плакалі дзяўчаты – і тыя, што знаходзіліся ўвесь час каля труны, і тыя, што

праходзілі строем. Кідалі кветкі. А праз колькі дзён прыйшоў ліст ад маці Ліды.

***(Голас за сцэнай).*** Лідачка! Дзіцятка ты мае роднае! Крывіначка ты мая! Ета ж такая радасць у нас, што пісьмо ад цябе прыйшло, Лідачка! Я ж усе тыя тры гады верыла, што ты жывая... І ў сне гаварыла з табой.

**3-і чытальнік.**
Успомнім усіх пайменна,
Горам успомнім сваім.
Гэта трэба не мёртвым –
Гэта трэба жывым!

*Чуцен стук метранома, на сцэну выходзяць 7 вучняў з фатаграфіямі землякоў-герояў успамінаюць загінуўшых.*



**Вучань 1:** Казакевіч Мечыслаў Іосіфавіч, нарадзіўся 15.07.1918 г. у в. Клебань Талачынскага раёна. Загінуў у 1945 годзе пры вызваленні Чэхаславакіі.



**Вучань 2:** Кучынскі Міхаіл Іванавіч, нарадзіўся у в. Коласава Талачынскага раёна ў 1920г. Загінуў у 1945 годзе пры вызваленні Чэхаславакіі.



**Вучань 3:** Гусачэнка Кузьма Васілевіч, нарадзіўся ў 1901г. у в. Чарнаручча Талачынскага раёна. Прапаў без вестак у 1944 годзе.



**Вучань 4:** Мацюшэўскі Міхаіл Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1907г.у В. Башарава Талачынскага раёна. Загінуў у 1945 годзе ва Усходняй Прусіі.



**Вучань 5:** Мацюшэўскі Анатоль Міхайлавіч, нарадзіўся ў 1925 годзе ў В.Башарава Талачынскага раёна. Загінуў у 1944 годзе ва Усходняй Прусіі.



**Вучань 6:** Бертуліс Іосіф Ігнатовіч, нарадзіўся у 1920 годзе ў в. Крывое Талачынскага раёна, загінуў у 1944 годзе падчас вызвалення Латвіі.



**Вучань 7:** Дорас Іван Мікалаевіч, нарадзіўся ў 1920г. у в. Высокі Гарадзец Талачынскага раёна. Прапаў без вестак у 1944 годзе.



**Вучань 8:** Хірэвіч Ягор Іванавіч, нарадзіўся ў 1917г. у в. Лазы Талачынскага раёна. Загінуў у канцы 1941 года.



**Вучань 9:** Скрупская Станіслава Адамаўна, нарадзілася ў г. Талачыне ў 1923г. Загінула ў кастрычніку 1941г. каля в. Хахлоўка Калужскай вобласці.



**Вучань 10:** Мядзюк Гаўрыла Рыгоравіч, нарадзіўся ў 1898 г. у в. Петрашы Талачынскага раёна. Загінуў ў 1944 г. пры вызваленні Польшчы.

*(Мінута маўчання.)*

**4-ы вядучы.** Жудасная памяць вайны, не сціхае гора, не затуманьваецца слава подзвігу народнага. Жыве сёння і ад пакалення ў пакаленне ідзе ў заўтра эстафета гэтай памяці.

*Гучыць вальс. На сцэну выбягае школьніца з розна-каляровымі шарамі ў руках і пачынае кружыцца.*
*За ёй выходзіць ветэран. Ён нейкі час слухае, глядзіць на яе, потым пачынае чытаць.*

**Ветэран.**
Грымяць, грымяць святочныя салюты...
І феерверкі зырка рассыпаюцца,
І дзетвара да батарэй збягаецца,
І смех, і крык на кожнай плошчы людной.
А мне заўсёды страшнавата робіцца,
Як неба засцілае дымам шызым,
І жаласна звіняць у вокнах шыбы,
І нечыя матулі сумна горбяцца.

*Дзяўчынка спыняецца, пачынае слухаць, а тады падыходзіць да дзеда з намерам супакоіць яго. Ветэран гладзіць яе па галаве.*

І прывіды мінулага ўстаюць.
І б'юць гарматы ў маладосць маю.
Сябры мае, прашу цішэй паліць.
Зямлі яшчэ баліць і мне баліць...

*Выступленне ветэрана Вялікай Айчыннай вайны.*
*Гучыць песня “Жураўлі”.*

**1-ы чытальнік.**
Адгулі, адгрымелі гарматы,
Хмары чорныя адплылі,
Прынясіце кветкі салдатам,
Што палеглі на нашай зямлі.
Пакланіцеся нізка-нізка
Тым, хто зведаў агонь і дым,
Чорным помнікам і абеліскам,
Слаўным зорачкам баявым.
Ля салдацкіх магіл памаўчыце.
Кожны з мужных салдат збярог
Цішыню і сонца ў блакіце
І сцяжынку на школьны парог.
Многа год пад сцягам крылатым
Крочыць мір па роднай зямлі.

Прынясіце кветкі салдатам,
Што свабоду для нас здабылі!

**2-я чытальніца.**
Я не глытала па акопах дыму
І франтавых не ведаю дарог.
Калі я нарадзілася, Радзіма,
Ты святкавала свята перамог.
І не выццё варожых самалётаў,
І не агонь, што пёк тваю зямлю, –
Чаромху помню, як цвіла ля плота,
Як падалі зярняты на раллю.
Цябе, вясняная, я помню ў цвеце,
Люблю з маленства, родная, люблю.
І за таго, каго няма на свеце,
Хто ўсё аддаў за гэтую зямлю.
Мае сябры ў жыцця да скону бралі
Усё, чым навучаем даражыць.
Мы за цябе яшчэ не паміралі,
Мы для цябе, Радзіма, будзем жыць!

**3-і чытальнік.**
Свяціся кропкай весела і звонка,
Нясі ў прастор свой непамерны груз,
Жыць будзе Беларусь – мая старонка,
Сярод зямлян жыць будзе беларус!

*Гучыць мелодыя песні "Радзіма мая дарагая"*
*(словы Алеся Бачылы, музыка Уладзіміра Алоўнікава).*

**Крыніцы інфармацыі:**

"І памяць гаворыць з намі..." Сцэнарый святочнага... : [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу : http://сцэнар.дамен.бел›dzen-peramogi/i-pamyac-gavoryc-z…

*ДАДАТАК 4*

*СЦЭНАРНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ*
*З ВЫКАРЫСТОЎВАННЕМ КРАЯЗНАЎЧЫХ КРЫНІЦ*
*(віктарыны, крыжаванка, бібліяграфічны агляд літаратуры)*

## "ЦІ ВЕДАЕШ ТЫ ПІЯНЕРАЎ-ГЕРОЯЎ" БЕЛАРУСІ?
***Віктарына***

*На аснове краязнаўчых матэрыялаў раім правесці віктарыну з чытачамі сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту. Да яе правядзення*

*аформіце кніжную выставу, на якой змясціце не толькі кнігі, прыведзеныя ніжэй, але і альбомы, а таксама падборкі артыкулаў з газет і часопісаў, у якіх апавядаецца аб юных героях Віцебшчыны.*

**Прыкладныя пытанні да віктарыны.**

**1.** Назавіце імёны піянераў Беларусі, якім было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза? Якія кнігі пра іх вы чыталі?

*Зіна Партнова – ленінградская піянерка, якую Вялікая Айчынная вайна застала ў Беларусі. Яна была членам Віцебскай падпольнай арганізацыі "Юныя мсціўцы". Пасмяротна ёй было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Аб яе жыцці і подзвігу расказваецца ў кнігах Рыгора Набатава "Юныя падпольшчыкі" і Васіля Смірнова "Зіна Партнова".*

*Марат Казей – партызан-разведчык з вёскі Станькова Дзяржынскага раёна Мінскай вобласці. За ўдзел у баявых дзеяннях юны партызан узнагароджаны медалямі "За баявыя заслугі", ордэнам Айчыннай вайны 1 ступені. Марату пасмяротна прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Аб подзвігу юнага героя расказваюць кнігі Вячаслава Марозава "Марат Казей", "В разведку шёл мальчишка", "Им было по четырнадцать", Станіслава Шушкевіча "Апавяданні пра Марата Казея".*

*Барыс Царыкаў – партызан-разведчык з Гомеля. За ўдзел у баявых дзеяннях узнагароджаны двума ордэнамі Баявога Чырвонага Сцяга. 30 кастрычніка 1943 года Барысу Царыкаву было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Пісьменнік Альберт Ліханаў прысвяціў юнаму герою кнігу "Боря Цариков".*

**2.** Каго з беларускіх піянераў называюць праўнукам Івана Сусаніна і чаму?

*Піянер Ціхан Баран з Ружанскага раёна Брэсцкай вобласці завёў нямецкіх карнікаў у незамярзаючыя балоты Ружанскай пушчы пад кулі партызан.*

**3.** Назавіце імёны юных герояў, абаронцаў Брэсцкай крэпасці. Якую кнігу пра іх вы чыталі?

*Пеця Клыпа, Валя Зенкіна, Нюра Кіжаватава, Пеця Васільеў, Коля Новікаў, Пеця Кацельнікаў, Валодзя Казьмін. Пра іх напісана кніга "Дзеці крэпасці", аўтар Алесь Махнач.*

**4.** Каму прысвечана кніга "Небяспека побач" і хто яе напісаў?

*Кніга прысвечана Грышы Герасіменку, Валодзю Хацкевічу, Марату Казею, Гену Каханоўскаму, Васю Краяняму. Аўтар кнігі – Міхась Ткачоў.*

**5.** Назавіце беларускага кампазітара, аўтара оперы “Марынка”. Каму яна прысвечана? Аб якім гераічным учынку юнай піянеркі ў ёй расказваецца? Хто аўтар лібрэта да оперы?

*Опера Рыгора Пуста “Марынка” прысвечана Мані Галафеевай, піянерцы з Добруша, якая выратавала піянерскі сцяг. Лібрэта для оперы напісала беларуская паэтэса Эдзі Агняцвет па яе ж паэме “Песня пра піянерскі сцяг”.*

**6.** Дзе ўстаноўлены помнік Марату Казею і хто яго аўтар?

*Помнік устаноўлены ў Мінску. Яго аўтар – беларускі скульптар Сяргей Селіханаў.*

**7.** Якія кнігі аб піянерах-героях Беларусі вы чыталі?

*Магчымыя адказы: (гл. спіс выкарыстанай літаратуры).*

**8.** Што вы ведаеце аб Надзі Багданавай? Хто аўтар кнігі аб ёй?

*Надзя – трынаццацігадовая партызанка, разведчыца. На яе рахунку мноства гераічных учынкаў. Кнігу аб ёй “Тры старонкі легенды” напісаў Генадзь Бураўкін.*

**9.** Назавіце імёны піянераў-герояў Віцебшчыны. Што вы ведаеце аб іх подзвігах?

*Звесткі аб піянерах-героях чытачы знойдуць у кнізе “Юные герои Витебщины”.*

**10.** Назавіце імёны юных герояў Талачыншчыны.

*Вячаслаў Шарай, Аляксандр Шмаўгонец, Анатоль Шафранскі, Васіль Стаброўскі, Мікалай Цыбульскі, Алег Беразнёў.*

**11.** Што вы ведаеце пра подзвіг Колі Цыбульскага, чатырнаццацігадовага партызана 5-га атрада брыгады “Чэкіст”?

*Коля Цыбульскі прыняў удзел у выратаванні ад карнікаў параненых байцоў атрада, прыняўшы агонь на сябе. За свае подзвігі Коля Цыбульскі ў 14-гадовым узросце быў узнагароджаны медалём “Партызану Вялікай Айчыннай вайны I ступені”.*

**Літаратура для падрыхтоўкі да віктарыны:**

**1. Агняцвет, Э.** Выратаваны сцяг: [пра Маню Галаванаву] / Эдзі Агняцвет. – Мінск : Беларусь, 1972. – 32 с. – (З арлінага племя).

**2. Бураўкін, Г.** Тры старонкі з легенды. Штрыхі аднаго лёсу : [пра юную партызанку Надзю Багданаву] / Генадзь Бураўкін. – Мінск : Беларусь, 1971. – 119 с.

**3. Васілеўская, Г.** Маланка ўначы : [пра Рыму Кунько] / Галіна Васілеўская. – Мінск, 1963. – 154 с.

**4. Дзеці вайны** : кніга народнай памяці / уклад. С. Папар, Л.М. Грамовіч. – Мінск : Юнацтва, 1993. – 239 с.

**5. Корзун, М.** Віця Сініца : дакументальная аповесць / Мікола Корзун. – Мінск : Беларусь, 1964. – 94 с.

**6. Махнач, А.** Дзеці крэпасці : нарыс / Алесь Махнач. – Мінск : Маст. літ., 1963. – 48 с.

**7. Марозаў, В.** Марат Казей / Вячаслаў Марозаў. – Мінск : Беларусь, 1970. – 32 с.

**8. Марозаў, В.** Як чуеш мяне, “Буравеснік”? : [пра Колю Сакалова] / Вячаслаў Марозаў. – Мінск : Беларусь, 1970. – 24 с. – (З арлінага племя).

**9. Морозов, В.** В разведку шёл мальчишка : [о Марате Казее] / Вячеслав Морозов. – Минск : Беларусь, 1963. – 256 с.

**10. Морозов, В.** Им было по четырнадцать : [о Марате Казее и Володе Щербацевиче] / Вячеслав Морозов. – Минск : Беларусь, 1965. – 191 с.

**11. Набатов, Г.О.** Юные подпольщики / Григорий Набатов. – Минск, 1966. – 144 с.

**12. Пионеры-герои.** – Минск : Беларусь, 1972. – 264 с.

**13. Слаўковіч, Д.** Сцежкаю мужных : [пра Косцю Будніка] Даір Слаўковіч. – Мінск 6 Беларусь, 1971. – 40 с. – (З арлінага племя).

**14. Смирнов, В.** Зина Портнова : повесть / Василий Смирнов. – Москва, 1980. – 221 с.

**15. Ткачоў, М.** Небяспека побач : дакум. нарысы : [пра Гену Каханоўскага, Грышу Герасіменка, Валодзю Хацкевіча, Васю крайняга, Марата Казея] / Міхась Ткачоў. – Мінск : Нар. асвета, 1972. – 136 с.

**16. Шымук, В.** Коля Гойшык / Віктар Шымук. – Мінск : Беларусь, 1971. – 24 с. – (З арлінага племя).

**17. Шымук, В.** Сын каваля : [пра Сярожу Маркевіча] / Віктар Шымук. – Мінск : Беларусь, 1970. – 24 с.

**18. Юные герои Витебщины** / Н.И. Дорофеенко [и др.] Минск : Нар. асвета, 1980. – 126 с.

## “ІШОЎ МОЙ КРАЙ ДАРОГАМІ ВАЙНЫ”
### *Віктарына*

*На аснове краязнаўчых матэрыялаў раім правесці віктарыну з чытачамі сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту. Да яе правядзення аформіце кніжную выставу, на якой змясціце не толькі кнігі, прыведзеныя ніжэй, але і альбомы, а таксама падборкі артыкулаў з газет і часопісаў, у якіх апавядаецца пра падзеі Вялікай Айчыннай вайны на Талачыншчыне.*

**Прыкладныя пытанні да віктарыны.**

**1.** Калі быў акупіраваны Талачынскі раён і горад Талачын нямецка-фашысцкімі захопнікамі?

*Талачынскі раён – у 1-й палове ліпеня, Талачын – 8 ліпеня 1941 г.*

**2.** Якія ваенныя фарміраванні вялі баі ў першыя дні Вялікай Айчыннай вайны на Талачыншчыне?

*Упартыя баі на тэрыторыі Талачынскага раёна вяла 1-я Маскоўская мотастралковая дывізія пад камандаваннем палкоўніка Я. Р. Крэйзера.*

**3.** У выніку якой аперацыі Чырвонай Арміі Талачыншчына была вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў?

*Беларуская наступальная аперацыя "Баграціён".*

**4.** Час вызвалення горада Талачын ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

*26 чэрвеня 1944 года.*

**5.** У якім годзе быў устаноўлены ў Талачыне помнік вызвалення?

*У 1969 годзе ў памяць аб вызваленні горада ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў на шашы Мінск – Масква пастаўлены помнік – скульптурная група: воін і партызан.*

**6.** Якое ваеннае падраздзяленне прымала ўдзел у вызваленні Коханава? Калі было вызвалена Коханава?

*Коханава было вызвалена 28 чэрвеня 1944 года сіламі 18-й танкавай брыгады, якой камандаваў падпалкоўнік В.І. Есіпенка.*

**7.** Назавіце імя камандзіра танкавай роты 19-й гвардзейскай Мінскай танкавай брыгады, якая першая ўвайшла ў Талачын у чэрвені 1944 года.

*Камандзір роты, старшы лейтэнант, Герой Савецкага Саюза Павел Іванавіч Дайнекін.*

**8.** Назавіце імя ганаровага грамадзяніна горада Ленінграда (Санкт-Пецярбурга), ураджэнца Віцебшчыны, Героя Вялікай Айчыннай вайны, чыё імя было ўпісана ў кнігу "Беларускі фронт" Залатой Кнігі Санкт-Пецярбурга".

*Андрэй Міхайлавіч Усаў.*

**9.** Вуліцы Талачына, названыя ў гонар партызан, падпольшчыкаў, герояў Вялікай Айчынная вайны.

*Лузгіна, Стаброўскага, Нарчука, Заслонава, Супруна, Жаўтухіна, Партызанская.*

**10.** Адна з вуліц Коханава названа імем гэтага героя, партызана-разведчыка пятага партызанскага атрада брыгады “Чэкіст”, ураджэнца Волагды. 8 мая 2015 года ў гарпасёлку Коханава быў адкрыты памятны знак па ўвекавечанні гераічнага, самаахвярнага ўчынку героя.

*Партызан-разведчык Валянцін Забадалаў.*

**11.** Яго імем названа адна з вуліц Мінска. Асноўныя звесткі: ураджэнец вёсцы Дроздава Азерацкага сельсавета, да вайны – першы сакратар Заслаўскага райкома КП(б)Б, у гады вайны – член Мінскага гарадскога падпольнага камітэта, загінуў у фашысцкіх засценках.

*Дзмітрый Андрэевіч Караткевіч.*

**12.** Назавіце імёны юных герояў Талачыншчыны.

*Вячаслаў Шарай, Аляксандр Шмаўгонец, Анатоль Шафранскі, Васіль Стаброўскі, Мікалай Цыбульскі, Алег Беразнёў.*

**13.** Назавіце імя французскага лётчыка з эскадрыллі “Нармандыя-Неман”, які загінуў у баі на тэрыторыі Талачыншчыны.

*Жак Гастон.*

**14.** Колькі партызанскіх брыгад дзейнічала на тэрыторыі нашага раёна? Назавіце найбольш вядомыя з іх.

*12 брыгад; найбольш вядомыя – “Граза”, “Чэкіст”, імя М.П. Гудкова.*

**15.** Назавіце імя сакратара камсамольскай арганізацыі партызанскай брыгады “Граза”.

*Мірон Чорны.*

**16.** Назавіце імя камандзіра аддзялення разведкі 5-га атрада партызанскай брыгады “Чэкіст” па мянушцы Казбек?

*Герой Савецкага Саюза Мамадалі Тапівалдыеў.*

**17.** Назавіце аўтара партызанскіх мемуараў “Партызаны Бука” – камісара адной з партызанскіх брыгад на тэрыторыі Талачыншчыны?

*У.П. Ільін, камісар 5-га атрада партызанскай брыгады Гудкова.*

**18.** Назавіце імя аўтара кнігі “За родныя хаты”, якая распавядае аб дзейнасці партызанскай брыгады М. Гудкова.

*Аркадзь Іосіфавіч Жураўскі.*

**19.** Назавіце імя пісьменніка, ураджэнца краю, які ў гады вайны быў партызанам атрада “Перамога” брыгады К. Заслонава, потым – мінёрам у спецгрупе “Непераможныя”.

*Алесь Рылько.*

**20.** Назавіце імя мінскай падпольшчыцы, ураджэнцы в. Серкавіцы, якая ўдзельнічала ў аперацыі па знішчэнню гаўляйтера Кубэ?

*Герой Савецкага Саюза Осіпава Марыя Барысаўна.*

**21.** Што вы ведаеце пра подзвіг Героя Савецкага Саюза Фёдара Кузьміча Анташкевіча?

*Камандзір гарматы ст сяржант Ф. Анташкевіч вызначыўся ў баях за г. Губен (Германія), разлік гарматы пад яго камандаваннем адбіў 8 варожых контратак, загінуў у баі.*

**22.** Вядома, што недалёка ад чыгуначнай станцыі Крынкі Лёзненскага раёна ўздзвігнут абеліск у гонар подзвігу нашага земляка, Героя Савецкага Саюза Галецкага Пятра Іванавіча. Які подзвіг здзейсніў у гэтым месцы П.І. Галецкі?

*21.10.1942 г. Пётр Галецкі з ўзрыўчаткай кінуўся пад варожы эшалон, у складзе якога было больш за 40 цыстэрнаў з гаручым, падарваў яго і загінуў сам.*

**23.** Хто з нашых землякоў, Герояў Савецкага Саюза, удзельнічалі ў фрасіраванні Дняпра ў верасні 1943 года?

*Целешаў Яўген Міхайлавіч, Макавецкі Фёдар Яфрэмавіч.*

**24.** Хто аўтар гэтых радкоў і з якой нагоды яны напісаны? “

…Ах, Толочин ты, Толочин,
Белорусский городок!
Здесь был немец поколочен,
Растолочен в порошок…”

*Ваенны карэспандэнт корпуснай газеты “Сталинская гвардия” Восіп Колычаў адразу пасля вызвалення Талачына напісаў новую главу сваёй паэмы “Аповесць пра Ваню Самаходава, вясёлага танкіста”.*

**25.** Назавіце імёны ўраджэнцаў краю, удзельнікаў Парада Перамогі на Чырвонай плошчы ў Маскве 24 чэрвеня 1945 года.

*І.Е. Даронін, М.М. Закрэўскі, М.С. Камельчык, І.Ц. Петракоў, Г.Ф. Шныркевіч, І.Д. Ярошкін.*

**26.** Назавіце адно з месц масавага знішчэння людзей на тэрыторыі краю, на поўначы ўсхода ад вёскі Маціёва? Калі быў пастаўлены помнік ахвярам фашызму і як ён выглядае?

*Урочышча Доўгава Балота, 1967 год, помнік у выглядзе стэлы з выявамі старога і жанчыны з дзіцём.*

**27.** Дзе ўстаноўлены помнік-абеліск двойчы Герою Савецкага Саюза С.П. Супруну?

*У чатырох кіламетрах ад магістралі, у вёсцы Палявая, недалёка ад месца гібелі героя.*

**28.** Вёска Талачынскага раёна, спаленая фашысцкімі захопнікамі 12 верасня 1942 года, паўтарыўшая лёс Хатыні.

*Вёска Рыдамля.*

**29.** Дзе ўстаноўлена мемарыяльная дошка памяці Герою Савецкага Саюза Анташкевічу Ф.К.

*Вёска Абольцы.*

**30.** Надпіс на памятным знаку абвяшчае: “Здесь покоятся воины-освободители, умершие от ран с 28.06 по 07.07.1944 года в передвижном хирургическом госпитале № 5160”. Дзе знаходзіцца гэты аб’ект?

*Памятны знак у вёсцы Драздова.*

**31.** Дзе на тэрыторыі краю ў гады вайны знаходзіліся габрэйскія гета?

*Талачын, Коханава, Слаўнае, Абольцы.*

**32.** Хто з беларускіх пісьменнікаў апісаў злачынствы нямецка-фашысцкіх захопнікаў супраць жыхароў вёскі Слаўнае?

*Васіль Быкаў у артыкуле “Жывыя – памяці мёртвых”.*

**33.** У якіх кнігах апісаны падзеі падрыхтоўкі і ажыццяўлення аперацыі “Адплата” з удзелам Марыі Осіпавай?

*Дакуменальныя аповесці Мікалая Дуброўскага “Бессмяротнасць подзвігу” і Алены Мазанік “Адплата”.*

**Літаратура для падрыхтоўкі да віктарыны:**

**1. “Белорусский фронт”** Золотой Книги Санкт-Петербурга / сост.: С.В. Григорьев. – Санкт-Петербург: Издательский дом “Золотая Книга”, 2018. – С. 93-131.

**2. Белоусов, К.М.** Зарево над Друтью / Константин Белоусов [бывший командир Могилёвской военно-оперативной группы]. – Минск : Беларусь, 1990. – 192 с. : 2 л. ил.

**3. Быкаў, В.У.** Праўдай адзінай : літаратурная крытыка, публіцыстыка, інтэрв’ю / Васіль Быкаў. – Мінск : Маст. літ., 1984. – 262 с. : 12 л. іл.

**4. В годы суровых испытаний** // Моя Толочинщина : страницы истории / А. А. Шнейдер. – Минск : Бизнесофсет, 2006. – С. 66–101.

**5. Винница, Г.** Слово памяти / Геннадий Винница. – Орша, 1997. – С. 23-34.

**6. Віцебшчына ў гады Вялікай Айчыннай вайны** : зб. навук. арт. / склад.: А.А. Крыварот [і інш.] ; рэкал.: А.А. Каваленя (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 2015. – 311 с.

**7. Дубровский, Н.** Бессмертие подвига : : документальная повесть / Николай Дубровский. _ минск : Народная асвета, 2007. – 143, ил.

**8. Жураўскі, А.** За родныя хаты. Партызанскія ўспаміны / Аркадзь Жураўскі. – Мінск : Беларусь, 1974. – 288 с.

**9. Збор помнікаў** гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць. – Мінск: БелСЭ, 1985. – С. 410-420.

**10. Ильин, В.** Партизаны Бука. Записки командира отряда / Владимир Ильин ; изд. 2-е. – Видное : “Вымпел”, 2004. – 500 с. : 7 с фото.

**11. Мазаник, Е.Г.** Возмездие : документальная повесть / Елена Мазаник ; лит. Запись А. Кейзарова. – Минск : Мастацкая літаратура, 1988. – 190с., ил.

**12. Севостьянов, Г.Н., Жуковская, В. П.** За линией фронта / Георгий Севостьянов, Вера Жуковская. – Минск : Беларусь, 1981. – 238 с. : 4 л. ил.

**13. Памяць:** гісторыка-дакументальная хроніка Талачынскага раёна / рэдкал.: І. П. Шамякін [і інш.] ; мастак А. М. Хількевіч. – Мінск : БелСЭ імя П. Броўкі, 1988. – С. 132–575.

**14. Прусский, И.М.** Партизанская бригада “Чекист” / Иван Максимович Прусский. – Толочин : Издатель И.М. Прусский, 1993. – 136 с.

**15. Талачынскі раён** // Памяць Беларусі : рэспубліканская кніга / рэдкал.: Г.П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2005. – С. 220–223.

**16. Юные герои** Витебщины / Н.И. Дорофеенко [и др.] Минск : Нар. асвета, 1980. – 126 с.

## “ТАЛАЧЫНШЧЫНА ПАРТЫЗАНСКАЯ”
***Бібліяграфічны агляд літаратуры***

На тэрыторыі раёна дзейнічалі Талачынскія падпольныя райкамы КП(б)Б і ЛКСМБ, партызанскія брыгады 1-я Смаленская, 2-я Беларуская імя Панамарэнкі (2-га складу), 2-я імя Заслонава, 8-я Круглянская, “Граза”, М.П. Гудкова, дыверсійная Беларуская імя Леніна, “Чэкіст”, Круглянская ваенна-аператыўная група, партызанскія палкі “Трынаццаць” і Смаленскі, партызанскія атрады 1-ы, 5-ы, 8-ы, 10-ы, 24-ы, 30-ы і “Трэці”, а таксама Магілёўскія партызанскія фарміраванні.

Пра гэтыя падзеі распавядаецца на старонках гісторыка-дакументальнай хронікі Талачынскага раёна “Памяць”. Раздзел кнігі “У гады суровых выпрабаванняў” змяшчае дакументальныя сведкі аб дзейнасці раённага падполля і партызанскіх фарміраванняў на тэрыторыі краю, паведамляе аб подзвігах партызан і падпольшчыкаў. Змешчаныя ў кнізе артыкулы мясцовых журналістаў перамежваюцца з успамінамі былых партызан і падпольшчыкаў, выпіскамі з дакументальных крыніц.

Вясной і летам 1942 г. на тэрыторыі раёна ўзнікла 12 партызанскіх груп. Для правядзення больш значных аперацый неабходна было аб'яднаць групы ў атрады. Так былі створаны атрады “Чэкіст”, “Гая”, “Перамога”, М.П.

Гудкова. Так званыя Віцебскія (Суражскія) “вароты”, што існавалі ў лютым – верасні 1942 года, садзейнічалі ўстанаўленню сувязей з Вялікай зямлёй. Праз іх для кіраўніцтва народнай барацьбой у Талачынскі раён прыбылі партыйныя работнікі С.М. Нарчук і М.А. Рашэтнікаў, узначаліўшыя атрад “Граза”, які пазней быў разгорнуты ў брыгаду ў складзе трох атрадаў.

Аб дзейнасці партызанскіх брыгад паведамляецца ў шэрагу выданняў. Так, у зборніку навуковых артыкулаў “Віцебшчына ў гады Вялікай Айчыннай вайны” маюцца сведкі аб стварэнні на Віцебшчыне партызанскі зон. У адну з іх – Сенненска-Аршанскую ўваходзілі партызанскія фарміраванні на тэрыторыі Талачыншчыны. У 1993 годзе была выдадзена кніга “Партызанская брыгада “Чэкіст” пад аўтарствам выкладчыка гісторыі Варанцэвічскай сярэдняй школы І.М. Прускага. Кніга пачынаецца апісаннем падзей ліпеня 1941 года, калі савецкімі ваеннаслужачымі, якія уцяклі з фашысцкага палону ці выйшлі з акружэння, на мяжы Шклоўскага, Круглянскага і Талачынскага раёнаў была створана партызанская брыгада “Чэкіст”. Баявы шлях брыгады завяршыўся у чэрвені 1944 года падчас злучэння з наступаючымі часцямі Савецкай Арміі. Пра баявы шлях гэтай партызанскай брыгады апавядаецца таксама ў кнізе Г. Севасцьянава і В. Жукоўскай “За лініяй фронту”. Пра баявы шлях партызанскай брыгады Гудкова апавядаецца ў кнізе камісара атрада Уладзіміра Ільіна “Партызаны Бука”. Партызанскімі ўспамінамі дзеліцца юны мсціўца брыгады Аркадзь Жураўскі ў кнізе “За родныя хаты”. Значнае месца ў гэтай кнізе адведзена жыццю і быту партызан.

На працягу лета 1942 г. дзякуючы паспяховым дзеянням партызан тэрыторыя Талачынскага раёна была амаль поўнасцю ачышчана ад варожых фарміраванняў, узмоцненыя гарнізоны засталіся толькі ў некалькіх буйных населеных пунктах. За лета 1942 г. партызанамі гэтых брыгад разам з асобнымі дыверсійнымі групамі на ўчастках Слаўнае – Коханава і Лотва – Шклоў былі падарваны каля 60 эшалонаў. Дзейнасць брыгад ажыццяўлялася разам з іншымі брыгадамі і злучэннямі, якія існавалі на тэрыторыі суседняй Магілёўшчыны. Пра гэта апавядаецца ў кнізе К. Белавусава “Зарево над Друтью”.

Буйную і добра арганізаваную аперацыю на чыгуначнай станцыі Слаўнае правялі партызаны некалькіх атрадаў 8-й Круглянскай брыгады пад агульным кіраўніцтвам камандзіра брыгады С.Г. Жуніна. 28.08.1942 г. у ходзе 3-гадзіннага бою гарнізон праціўніка быў разгромлены. Партызаны знішчылі будынак станцыі, 6 складоў з ваеннай маёмасцю, харчаваннем і фуражом, казармы гітлераўцаў, будынак валасной управы, 2 вайсковыя эшалоны з тэхнікай, вывелі са строю 2 вадакачкі, воданапорную вежу. Сумесна з групамі рэзерву падарвалі і знялі рэйкі на працягу 3 км, знішчылі каля 5 км тэлефонна-тэлеграфнай лініі сувязі. Праціўнік страціў забітымі каля 120 чалавек. У выніку бою рух па чыгунцы быў затрыманы на некалькі сутак. Фашысцкае камандаванне за гэту ваенную акцыю партызан сагнала сваю злосць на мірных жыхарах. Гітлераўцы вывезлі ў Крупкі і расстралялі

100 мірных жыхароў Талачыншчыны, сярод якіх былі старыя, жанчыны, дзеці. Пра гэтыя падзеі распавядаецца ў публіцыстычным артыкуле Васіля Быкава "Жывыя – памяці мёртвых", змешчаным у крытыка-публіцыстычным зборніку народнага пісьменніка Беларусі пад назвай "Праўдай адзінай".

У ліпені 1943 года распачаў работу Талачынскі падпольны райкам партыі, які ажыццяўляў арганізацыйнае і палітычнае кіраўніцтва дзейнасцю партызанскіх брыгад. У жніўні 1942 года на тэрыторыю раёна прыбыла ўпаўнаважаная ЦК ЛКСМБ па Талачынскім раёне Л.М. Міхайлава.

У час правядзення аперацыі "рэйкавая вайна" партызаны 2-й брыгады імя Заслонава падарвалі больш за 300 рэек, 8-й Круглянскай брыгады – больш за 1 тыс. рэек, брыгады "Гроза" – больш за 500 рэек, вялі баі каля в. Рыдамля, Усвейкі, Мураўнічы, у лютым 1944 г. разграмілі варожы гарнізон у в. Курчаўская Усвейка, партызаны брыгады М.П. Гудкова падарвалі больш за 40 эшалонаў, у жніўні 1943 г. – больш за 500 рэек, партызаны 5-га атрада – больш за 100 рэек, з мая 1943 г. да мая 1944 г. падарвалі 33 эшалоны, на станцыі Талачын спалілі склад з боепрыпасамі, 8-га атрада – больш за 120 рэек.

Падчас Вялікай Айчыннай вайны больш за 10 тысяч талачынцаў абаранялі гонар і незалежнасць Радзімы на фронце. Жыхары Талачыншчыны памятаюць подзвігі і імёны народных мсціўцаў: Д.М. Катлярчук, С.М. Нарчук, Г.А. Кірпіч, М.П. Гудкоў, М.А. Рашэтнікаў, Ф.М. Сядлецкі, Ф.І. Букштынаў, Ф.П. Ігнатовіч, А.Р. Мачахоўскі, У.Б. Захарэвіч, І.С. Чэпік, Н.І. Палякова, М.І. Бондарава, Е.М. Шумская, М. Тапівалдыеў і інш. Сярод іх – юныя партызаны: Саша Шмаўгонец, Слава Шарай, Толя Шафранскі, Коля Цыбульскі, Валодзя Благуш, Вася Стаброўскі, Алег Беразнеў. Два з дзевяці партызанскіх генералаў І.М. Кардовіч і І.П. Кожар – ураджэнцы Талачыншчыны.

**Літаратура:**


**1. Быкаў, В.У.** Праўдай адзінай : літаратурная крытыка, публіцыстыка, інтэрв'ю / Васіль Быкаў. – Мінск : Маст. літ., 1984. – 262 с. : 12 л. іл.

**2. Белоусов, К.М.** Зарево над Друтью / Константин Белоусов [бывший командир Могилёвской военно-оперативной группы]. – Минск : Беларусь, 1990. – 192 с. : 2 л. ил.

**3. В годы суровых испытаний** // Моя Толочинщина : страницы истории / А. А. Шнейдер. – Минск : Бизнесофсет, 2006. – С. 66–101.

**4. Віцебшчына ў гады Вялікай Айчыннай вайны** : зб. навук. арт. / склад.: А.А. Крыварот [і інш.] ; рэкал.: А.А. Каваленя (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 2015. – 311 с.

**5. Жураўскі, А.** За родныя хаты. Партызанскія ўспаміны / Аркадзь Жураўскі. — Мінск : Беларусь, 1974. – 288 с.

**6. Ильин, В.** Партизаны Бука. Записки командира отряда / Владимир Ильин ; изд. 2-е. – Видное : "Вымпел", 2004. – 500 с. : 7 с фото.

**7. Севостьянов, Г.Н., Жуковская, В. П.** За линией фронта / Георгий Севостьянов, Вера Жуковская. – Минск : Беларусь, 1981. – 238 с. : 4 л. ил.

**8. Памяць:** гісторыка-дакументальная хроніка Талачынскага раёна / рэдкал.: І. П. Шамякін [і інш.] ; мастак А. М. Хількевіч. – Мінск : БелСЭ імя П. Броўкі, 1988. – С. 132–575.

**9. Прусский, И.М.** Партизанская бригада “Чекист” / Иван Максимович Прусский. – Толочин : Издатель И.М. Прусский, 1993. – 136 с.

**10. Талачынскі раён** // Памяць Беларусі : рэспубліканская кніга / рэдкал.: Г.П. Пашкоў [і інш.]. – Мінск : БелЭн, 2005. – С. 220–223.

## “ТАЛАЧЫНШЧЫНА ПАРТЫЗАНСКАЯ”

***Крыжаванка***

| | | | | | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | | | | | | Т | А | Л | А | Ч | Ы | Н | |
| 2 | | | | | Б | А | Г | Р | А | Ц | І | Ё | Н |
| 3 | | | | | І | Л | Ь | І | Н | | | | |
| 4 | | | | | К | А | Р | Д | О | В | І | Ч | |
| 5 | | | | | | Ч | Э | К | І | С | Т | | |
| 6 | | | | | Р | Ы | Л | Ь | К | О | | | |
| 7 | | | Ч | О | Р | Н | Ы | | | | | | |
| 8 | | | | | | Ш | А | Р | А | Й | | | |
| 9 | | | | М | А | Ч | А | Х | О | Ў | С | К | І |
| 10 | | | | | Ц | Ы | Б | У | Л | Ь | С | К | І |
| 11 | | | | | Ш | Н | Э | Й | Д | А | Р | | |
| 12 | | | З | А | Б | А | Д | А | Л | А | Ў | | |
| 13 | | | К | І | Р | П | І | Ч | | | | | |
| 14 | | | Р | А | Ц | А | Ў | С | К | І | | | |
| 15 | | | | Ж | У | Р | А | Ў | С | К | І | | |
| 16 | | | | Л | І | Т | В | І | Н | А | В | А | |
| 17 | | | | | Б | Ы | К | А | Ў | | | | |
| 18 | | | | | У | З | Н | О | С | Н | А | Е | |
| 19 | | | | С | Т | А | Б | Р | О | Ў | С | К | І |
| 20 | | С | Л | А | Ў | Н | А | Е | | | | | |
| 21 | | | П | Р | У | С | К | І | | | | | |
| 22 | | | Г | У | Д | К | О | В | А | | | | |
| 23 | Т | А | П | І | В | А | Л | Д | Ы | Е | Ў | | |
| 24 | К | Р | У | Г | Л | Я | Н | С | К | І | | | |

**Ключавое слова: ТАЛАЧЫНШЧЫНА ПАРТЫЗАНСКАЯ**

**Пытанні да крыжаванкі “Талачыншчына партызанская”.**

**1.** У якім населеным пункце раёна ў 1969 годзе ўстаноўлены помнік у выглядзе скульптурнай групы воіна і партызана?

Адказ: ***Талачын.***

**2.** У выніку якой аперацыі Чырвонай Арміі Талачыншчына была вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў?

Адказ: беларускай наступальнай аперацыі ***“Баграціён”***.

**3.** Назавіце аўтара партызанскіх мемуараў “Партызаны Бука” – камісара адной з партызанскіх брыгад на тэрыторыі Талачыншчыны?

Адказ: Уладзімір Пятровіч ***Ільін***, камісар 5-га атрада партызанскай брыгады Гудкова.

**4.** Адзін з вядомых партызанскіх генералаў, ураджэнец вёскі Друцк Талачынскага раёна.

Адказ: Іосіф Мітрафанавіч ***Кардовіч***.

**5.** Партызанскі атрад, арганізаваны на поўдні раёна вясной 1942 года.

Адказ: “***Чэкіст***”.

**6.** Партызан атрада “Перамога” брыгады К. Заслонава, з верасня 1943 года – мінёр у спецгрупе “Непераможныя”, пісьменнік, ураджэнец вёскі Рыдамля Талачынскага раёна.

Адказ: Алесь ***Рылько.***

**7.** Назавіце імя сакратара камсамольскай арганізацыі партызанскай брыгады “Граза”.

Адказ: Мірон ***Чорны***.

**8.** Юны партызан атрада імя А.В. Суворава партызанскай брыгады “Граза”, вясной 1944 года прымаў удзел у выратаванні ад карнікаў цяжкапараненых, пасля вайны працаваў карэспандэнтам Талачынскага радыёвяшчання.

Адказ: Вячаслаў ***Шарай***.

**9.** Разведчык партызанскай брыгады “Чэкіст”, прымаў удзел у ліквідацыі шматлікіх банд, у тым ліку “шэрай кошкі” ў Барысаве, у пасляваенны час больш дваццаці гадоў працаваў у органах МУС Казахстана, у іншых месцах краіны, у апарце Талачынскага райвыканкама.

Адказ: Анатоль Раманавіч ***Мачахоўскі***.

**10.** Чатырнаццацігадовы партызан 5-га атрада брыгады “Чэкіст”, прыняўшы агонь на сябе падчас выратавання ад карнікаў параненых байцоў атрада, ўзнагароджаны медалём “Партызану Вялікай Айчыннай вайны I ступені”.

Адказ: Коля ***Цыбульскі***.

**11.** Вядомы краязнаўца, адзін з даследчыкаў партызанскага руху на Талачыншчыне, аўтар кнігі “Талачыншчына. Старонкі гісторыі”.

Адказ: Анатоль Антонавіч ***Шнэйдар***.

**12.** Адна з вуліц Коханава названа імем гэтага героя, партызана-разведчыка пятага партызанскага атрада брыгады “Чэкіст”, ураджэнца Волагды. 8 мая 2015 года ў гарпасёлку Коханава быў адкрыты памятны знак па ўвекавечанні гераічнага, самаахвярнага ўчынку героя.

Адказ: Партызан-разведчык Валянцін ***Забадалаў***.

**13.** Камандзір партызанскай брыгады “Чэкіст” (май 1942 – жнівень 1943).

Адказ: Герасім Аляксеевіч ***Кірпіч***.

**14.** У якім лесе (назва) базіраваліся асноўныя сілы брыгады “Чэкіст”?

Адказ: ***Рацаўскі***.

**15.** Назавіце імя вядомага земляка, ураджэнца в. Янава, былога партызана партызанскай брыгады М.Гудкова, у мірны час член-карэспандэнта НАН РБ, доктара філалагічных навук, прафесара.

Адказ: Аркадзь Іосіфавіч ***Жураўскі***.

**16.** Партызанка-разведчыца брыгады імя Гудкова, пасля вайны працавала настаўніцай у Талачынскай СШ, потым у дзіцячай бібліятэцы.

Адказ: Ніна Міхайлаўна ***Літвінава***.

**17.** Хто з беларускіх пісьменнікаў напісаў пра злачынствы нямецка-фашысцкіх захопнікаў супраць жыхароў вёскі Слаўнае?

Адказ: Васіль ***Быкаў*** у артыкуле “Жывыя – памяці мёртвых”.

**18.** Каля якой вёскі Талачынскага раёна ўстаноўлены мемарыяльны знак на месцы размяшчэння партызанскай брыгады Гудкова?

Адказ: ***Узноснае***.

**19.** Адна з вуліц Талачына, названая ў гонар юнага партызана. Назавіце імя героя

Адказ: Вуліца імя Стаброўскага (***Стаброўскі***).

**20.** На якой чыгуначнай станцыі на тэрыторыі Талачынскага раёна партызаны 8-й Круглянскай брыгады ў ноч на 28 жніўня 1942 года правялі аперацыю па разгрому нямецкага гарнізона?

Адказ: ***Слаўнае***.

**21.** Аўтар кнігі "Партызанская брыгада "Чэкіст".

Адказ: Іван Максімавіч ***Прускі***.

**22.** Якая брыгада атрымала назву па прозвішчу свайго камандзіра?

Адказ: Брыгада ***Гудкова***.

**23.** Назавіце імя камандзіра аддзялення разведкі 5-га атрада партызанскай брыгады "Чэкіст" па мянушцы Казбек?

Адказ: Герой Савецкага Саюза Мамадалі ***Тапівалдыеў***.

**24.** Адзін з раёнаў Магілёўскай вобласці, на тэрыторыі якога дзейнічала партызанская брыгада "Чэкіст".

Адказ: ***Круглянскі***.

**Літаратура:**

**1. Быкаў, В.** Праўдай адзінай : літаратурная крытка, публіцыстыка, інтэрв'ю / Васіль Быкаў. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1984. – С. 6 – 20.

**3. Жураўскі, А.** За родныя хаты. Партызанскія ўспаміны / Аркадзь Жураўскі. – Мінск : Беларусь, 1974. – 288 с.

**4. Збор помнікаў** гісторыі і культуры Беларусі. Віцебская вобласць / рэдкал. С.В. Марцэлаў [і інш.]. – Мінск, 1985. – С. 410-420.

**5. Памяць** : гісторыка-дакументальная хроніка Талачынскага раёна / рэдкал.: І.П. Шамякін [і інш.]; маст. А.М. Хількевіч – Мінск : БелСЭ, 1988. – 654 с., іл.

**6. Мазаник, Е.Г.** Возмездие : документальная повесть / Елена Мазаник ; лит. Запись А. Кейзарова. – минск : мастацкая литаратура, 1988. – 190с., ил.

**7. Дубровский, Н.** Бессмертие подвига : : документальная повесть / Николай Дубровский. _ минск : Народная асвета, 2007. – 143, ил.

**8. Юные герои Витебщины** / Н.И. Дорофеенко [и др.] Минск : Нар. асвета, 1980. – 126 с.

**Інтэрнэт-рэсурсы:**

**1. Государственное учреждение** "Толочинский историко-краеведческий музей" [Электронный ресурс] : сайт. – Режим доступа : tolochin.museum.by.

**ЗАКЛЮЧЭННЕ.**

Сучаснаму грамадству неабходная асоба, здольная да стварэння, самаўдасканалення і самаразвіцця. Гэта прадугледжвае неабходнасць фарміравання ў падрастаючага пакалення, высокіх маральных, маральна-

псіхалагічных і этычных якасцяў, сярод якіх важнае значэнне мае патрыятызм, грамадзянскасць, адказнасць за лёс Айчыны і гатоўнасць да яго абароны, культура міжнацыянальных адносін.

Прапаганда ваенна-патрыятычнай кнігі, а таксама прыцягненне дзяцей і моладзі да краязнаўства разглядаецца сёння як важнае звяно патрыятычнага выхавання. Выкарыстанне краязнаўчай літаратуры прадвызначае духоўнасць падрастаючага пакалення, садзейнічае гарманічнаму росту асобы. Бібліятэкі назапасілі вялікі вопыт у выкарыстанні самых разнастайных формаў і метадаў раскрыцця сваіх фондаў, далучэння дзяцей да чытання літаратуры, якая спрыяе фарміраванню патрыятызму.

Такім чынам, можна сказаць, што бібліятэка – магутны сацыяльны інстытут, які забяспечвае арганізацыю і функцыянаванне сістэмы патрыятычнага выхавання.

**СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ:**


1. **Вы праз агонь Перамогу пранеслі** : метадычныя парады бібліятэкарам / ДУ “Віцебская абласная бібліятэка імя У.І. Леніна” ; аддзел бібліятэказнаўства, навуковых даследаванняў і праблем культуры ; [склад. Л.С. Гудзелева] – Віцебск, 2009. – С. 24-27.
2. **“Детям о войне”.** Рекомендательный список литературы / Образовательная социальная сеть nsportal.ru : [электронный ресурс]. – Режим доступа: nsportal.ru›shkola/raznoe/library/2017/05/18/…
3. **Методические рекомендации** по патриотическому направлению работы библиотек: [электронный ресурс]. – Режим доступа: birsklib.com›doc/metod/MR_patrioticheskoe_…
4. **О Программе патриотического воспитания населения** Республики Беларусь на 2022 – 2025 годы : Постановление Совета Министров Республики Беларусь 29 декабря 2021 г. № 773 / Национальный правовой Интернет-портал Республики Беларусь : [электронный ресурс]. – Режим доступа: bgam.by›wp-content/uploads/2022/01/…
5. **Роль библиотеки в патриотическом воспитании школьников** (творческая работа) / Образовательная социальная сеть nsportal.ru : [электронный ресурс]. – Режим доступа: nsportal.ru›shkola/vneklassnaya-rabota/library/…



***Складальнік:***
***бібліятэкар аддзела бібліятэчнага маркетынгу***
***І. Труханёнак***